БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЕЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

31 снежня 1994 г.
Субота
№ 141(13858)
Кошт у розніцу 40 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

ГОД 1994-Ы: ПОГЛЯД КОНСУЛА БЕЛАРУСІ Ў ЛОНДАНЕ А.ЯКАВІЦКАГА. 2

СВЯТА ПА-АМЕРЫКАНСКУ. ЯК СУСТРАКАЮЦЬ НОВЫ ГОД ЗА АКІЯНАМ? 2

ЗІМОВЫ РАМАН. 3

НАША СВЯТОЧНАЯ ГОСЦЯ – ІНА АФАНАСЬЕВА. 3

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ. 4

Малюнак Ірыны АМЕЛЬЯНОВІЧ.

Пярэдадзень

Да Новага года — хвіліна адна.
За што ж нам прыгубіць сягоння віна?
За шчасце — ці што, каб не мучыцца ў скрусе?
Не веру я ў шчасце, я з ім не ў хаўрусе.

А можа, нам выпіць віна за любоў?
Кахаў я аднойчы — не хочацца зноў.
За гора? Да д'ябла! За гора не п'юць!
За што ж нам глынуць?.. Бо куранты ўжо б'юць!

Ах, так ці не гэтак...
А мне ўсё адно!
Дык вып'ем за тое,
што ў чарках віно!

Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ.

Кур'ер "ЧЗ"

З падарункамі да дзяцей

З хлебам і соллю сустрэлі вучні і настаўнікі Радашковіцкай школы-інтэрната міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Юрыя Захаранку.

Яго азнаёмілі з вучэбнымі класамі і кабінетамі школы, створаным у выніку пошукавай работы дзяцей музеем М.Гастэлы, прысутнічаў міністр на школьным навагоднім свяце. Юрый Захаранка павіншаваў дзяцей і іх выхавальнікаў з надыходзячым Новым годам і паведаміў аб прынятым рашэнні выдзеліць школе-інтэрнату для гаспадарчых патрэб грузавы аўтамабіль, паабяцаў дапамагчы ў абсталяванні камп'ютэрнага класа.

Перад удзельнікамі навагодняга балю з цікавай канцэртнай праграмай выступіў ансамбль УУС Мінгарвыканкама.

Васіль КУРЛОВІЧ, прэс-служба МУС.

Віншаванне Філарэта

Напярэдадні Новага года Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі выступіў з Пасланнем, прысвечаным Ражству Хрыстову.

Прадстаўнік праваслаўнай царквы павіншаваў усіх братоў-хрысціян розных канфесій са святам Ражства і Новым годам.

УЛ.ІНФ.

У Новым годзе – з новым эталонам часу...

У рэспубліцы распрацаваны першы нацыянальны эталон часу. Яго аўтарамі сталі спецыялісты Мінскага цэнтра стандартызацыі і метралогіі сумесна з адным з вядучых інстытутаў Расіі. Напярэдадні Новага 1995 года калегія Камітэта па метралогіі, стандартызацыі і сертыфікацыі зацвердзіла гэты эталон у якасці нацыянальнага эталону часу, частаты і шкалы часу Рэспублікі Беларусь.

Новы нацыянальны эталон часу ўяўляе сабой вялікі комплекс высокадакладнай апаратуры і забяспечвае кругласутачнае правядзенне работ па ўзнаўленню і захаванню адзінкі часу і частаты. Лабараторыя, у якой "захоўваецца" гэты час, пастаянна звярае свае "вынаходствы" з аналагічнымі эталонамі Германіі, ЗША, Францыі і Швейцарыі.

...і з новымі бацькамі

У новым годзе ў 20 выхаванцаў Магілёўскага дашкольнага дзіцячага дома будуць бацькі.

Перад бацькамі, якія вырашылі ўсынавіць дзіця, выступілі ўрачы, псіхолагі, юрысты і тыя, хто ўжо выхоўвае "дзетдомаўцаў". Пасля тэарэтычнай падрыхтоўкі патэнцыяльныя бацькі пазнаёміліся з малышамі. Дваццаць сем'яў з Магілёва і раёнаў вобласці падалі заявы на ўсынаўленне дзіцяці. Пакуль ідзе працэдура афармлення дакументаў, шчаслівыя дзеці жывуць надзеяй, што ў іх будуць бацькі. Дададзім, што ў адыходзячым годзе з гэтай дзіцячай установы ўзялі на выхаванне ўжо сорак хлопчыкаў і дзяўчынак.

Святочны напітак

Упершыню на навагоднім стале ў жыхароў Магілёўшчыны з'явіцца мясцовы бальзам. Да надыходзячага свята яго выпусціў Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод. Прадукцыя ўжо адпраўлена ў фірменны магазін раённага цэнтра і гандлёвую сетку вобласці.

Дэгустацыйная камісія "Белхарчпрама" дала высокую ацэнку гэтаму напітку. Бальзам "Клімавіцкі" не толькі не саступае славутаму "Рыжскаму", а нават пераўзыходзіць яго. Для прыгатавання бальзаму выкарыстоўваецца дваццаць тры кампаненты траў і іншых дабавак, якія прадпрыемства пакуль закупляе. Але ўжо ў наступным годзе завод збіраецца вырошчваць сам духмяную сыравіну. З гэтай мэтай намячаецца аб'яднанне з мясцовым калгасам імя Янкі Купалы. Тут плануецца пасеяць усе неабходныя травы, стварыць вялікі пчальнік.

Начны "зоркапад"

Тых, хто ў навагоднюю ноч аддасць перавагу Беларускаму тэлебачанню, ужо з першых мінут Новага года чакае амаль двухгадзінны "зоркапад". На блакітным экране будуць выступаць беларускія спевакі і групы, а таксама кампазітары, паэты, прадзюсары, мецэнаты, якія сталі пераможцамі тэлевізійнага фестывалю "Фывары года". Шоу, здымкі якога праходзілі ў Цэнтральным Доме афіцэраў, абяцае быць яркім і святочным.

На колькасць дыпломаў арганізатары фестывалю не паскупіліся. Так, "адкрыццём года" прызнана новая салістка ансамбля "Верасы" Ірына Дарафеева. Адпаведна лаўры лепшага прадзюсера дасталіся кіраўніку гэтага калектыву Васілю Раінчыку. Студыяй нумар адзін названы "Сябры". Відаць, каб не спудзіць спонсараў, званне "Мецэната года" прысвоена адразу пяцярым прадстаўнікам дзелавых колаў рэспублікі. Спонсары таксама ўстанавілі ўласны прыз і прысудзілі яго маладому спеваку з Гомеля Сяргею Сількевічу.

Лідэрам сярод паэтаў-песеннікаў у 1994 годзе стаў Мікалай Траццякоў. Але, здаецца, у яго з'явіўся нечаканы канкурэнт — Зянон Пазьняк. Кампазітар Ігар Лучанок напісаў на яго вершы песню "Авэ Марыя", якая заваявала першую пазіцыю ў намінацыі "Песня года". Рангу "Маэстра года" ўдастоіўся народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік і дырыжор Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Міхаіл Фінберг. Першым рэжысёрам прызнаны Бахціяр Бахціяраў, які ўзначаліў нядаўна галоўную дырэкцыю праграм Беларускага тэлебачання. Прыз сімпатый гледачоў салістцы студыі "Сябры" Алесі прынесла песня "Жаўраначак", а адзін з яе аўтараў-кампазітар Эдуард Ханок названы "Мэтрам песеннай эстрады". У сваю чаргу яго дачка Святлана аб'яўлена "Дэбютам года".

Застаецца дадаць, што дыпломы лепшых спевакоў года атрымалі Іна Афанасьева і Аляксандр Саладуха. Сярод кампазітараў на першым месцы стаіць Алег Елісеенка. Але самы ганаровы тытул атрымалі нашы легендарныя "Песняры". Іх назвалі фаварытамі 25-годдзя.

БЕЛІНФАРМ.

Курсы валют на 30 снежня:

	Даляр ЗША		Ням. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	9850	10150	6205	6435
"Алімп"	9760	10000	6177	6329
"Солід"	9600	10200	6000	6450

Указ
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Аб неадкладных мерах па барацьбе са злачыннасцю і стабілізацыі абстаноўкі ў Рэспубліцы Беларусь

Нягледзячы на прымаемыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь меры па выхаду рэспублікі з крызісу, эканамічная і сацыяльна-палітычная абстаноўка застаецца складанай. Узмацняе сацыяльную напружанасць і высокі ўзровень злачыннасці. Праваахоўным органам яшчэ не ўдалося спыніць рост цяжкіх злачынстваў. Многія супрацоўнікі гэтых органаў не ў поўнай меры выкарыстоўваюць прадастаўленыя заканадаўствам магчымасці для абароны інтарэсаў грамадзян, часта не рэагуюць на іх заявы аб крадзяжах і іншых проціпраўных дзеяннях, якія ўчыняюцца службовымі асобамі. Бяздзейнасць органаў выканаўчай улады на месцах, беспакаранасць злачынцаў падрываюць у насельніцтва веру ў здольнасць дзяржавы забяспечыць у рэспубліцы правапарадак і захаванне прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам. Нездавальненне народа выклікае дзейнасць шэрагу камерцыйных структур, якія нажываюцца за яго кошт.

У мэтах забеспячэння абароны насельніцтва ад злачыннасці і стабілізацыі абстаноўкі ў рэспубліцы:

1. Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

1.1. У двухмесячны тэрмін падрыхтаваць і ва ўстаноўленым парадку прадставіць на разгляд Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь праекты законаў:

аб устанаўленні крымінальнай адказнасці за злоснае парушэнне правіл адміністрацыйнага нагляду;

аб змяненні пераліку злачынстваў, вытворчасць па якіх ажыццяўляецца ў парадку прамакольнай формы дасудовай падрыхтоўкі матэрыялаў;

аб барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй;

аб прэвентыўным затрыманні;

аб устанаўленні адказнасці грамадзян за незаконнае набыццё, захоўванне, нашэнне газавай зброі;

аб узмацненні крымінальнай адказнасці за злачынствы супраць уласнасці;

аб павелічэнні да 10 сутак тэрміну затрымання асоб, падазроных ва ўчыненні цяжкіх злачынстваў;

аб абароне сведкаў, пацярпеўшых і іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу ад злачынных замахаў;

аб унясенні змяненняў у закон Рэспублікі Беларусь "Аб міліцыі";

аб расшырэнні кампетэнцыі начальнікаў аддзяленняў і ўчасткаў міліцыі па разгляду матэрыялаў аб адміністрацыйных правапарушэннях;

аб ліквідацыі прадпрыемстваў недзяржаўных форм уласнасці і спыненні прадпрымальніцкай дзейнасці фізічных асоб з-за парушэння імі заканадаўства ў сферы цэнаўтварэння;

1.2. Разгледзець да 30 студзеня 1995 г. ход выканання дзяржаўнай праграмы першачарговых мер па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю, забяспечваць своечасовае яе фінансаванне, выдзяленне неабходных грашовых рэсурсаў для набыцця сучасных спецыяльных сродкаў, тэхнікі і аснашчэння імі праваахоўных органаў;

1.3. Да 30 студзеня 1995 г. стварыць апарат для правядзення рэвізіі па даручэннях і пастановах аператыўных і следчых работнікаў органаў унутраных спраў, пракуратуры, дзяржаўнай бяспекі, пастановах судоў (суддзяў);

1.4. У двухмесячны тэрмін распрацаваць новую форму дэкларацыі аб даходах грамадзян, прадугледзеўшы ў ёй указанне звестак аб наяўнасці ўласнасці і грашовых сродкаў, а таксама ўнесці ва ўстаноўленым парадку прапановы аб узмацненні адказнасці за наўмыснае прадстаўленне няпоўнай, недакладнай або скажонай інфармацыі аб даходах;

1.5. У трохмесячны тэрмін распрацаваць комплекс мер маральнага і матэрыяльнага стымулявання працы следчых і аператыўных работнікаў правахоўных органаў, аператыўных работнікаў пагранічных войскаў і работнікаў мытных органаў у залежнасці ад узроўню іх падрыхтоўкі, стажу і характару работы для замацавання ўказаных работнікаў у гэтых органах.

2. Кіраўнікам мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у месячны тэрмін разгледзець пытанне аб абгрунтаванасці кантрактаў, заключаных з кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў, якія належаць адміністрацыйна-тэрытарыяльным утварэнням на праве камунальнай уласнасці.

3. Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам павысіць адказнасць кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў за безгаспадарчасць, нездавальняючую арганізацыю ўліку, незабеспячэнне захаванасці дзяржаўнай уласнасці і пры неабходнасці ва ўстаноўленым парадку прымяняць да іх меры дысцыплінарнага ўздзеяння аж да зняцця з пасад.

4. Міністэрству ўнутраных спраў да 30 студзеня 1995 г. праверыць захаванне суб'ектамі гаспадарання, заснаванымі на дзяржаўнай форме ўласнасці, адпаведнасці месц захоўвання таварна-матэрыяльных каштоўнасцей і грашовых сродкаў нормам тэхнічнай аснашчанасці і пажарнай бяспекі. У выпадку іх грубага парушэння суб'екты гаспадарання па прадстаўленню Міністэрства ўнутраных спраў пазбаўляюцца ліцэнзіі органамі, якія выдалі гэтыя ліцэнзіі. У далейшым указаным суб'ектам гаспадарання ліцэнзіі выдаюцца толькі пасля атрымання ад іх заключэнняў органаў унутраных спраў аб адпаведнасці месц захоўвання таварна-матэрыяльных каштоўнасцей і грашовых сродкаў гэтым нормам.

5. Кіраўнікам банкаў, фінансавых, мытных органаў, прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў бесперашкодна прадастаўляць па пісьмовуму патрабаванню следчых работнікаў (па матэрыялах і расследуемых крымінальных справах), а таксама кіраўнікоў падраздзяленняў па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, злачыннасцю ў сферы эканомікі органаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі афіцыйныя дакументы, неабходныя для раскрыцця і спынення злачынстваў.

6. Службе кантролю адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у студзеньлютым 1995 г. правесці праверкі работы цэнтральных і мясцовых органаў кіравання ў сувязі са скаргамі і заявамі грамадзян. Матэрыялы аб фактах парушэння заканадаўства накіраваць у праваахоўныя органы для прыцягнення вінаватых да адказнасці.

7. Камітэту па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Міністэрства адукацыі і навукі ў шасцімесячны тэрмін з улікам прапаноў Міністэрства ўнутраных спраў унесці ў нарматыўна-тэхнічную дакументацыю па праектаванню і будаўніцтву змяненні і далучэнні ў частцы павышэння бяспекі жылля ад злачынных замахаў на ўласнасць грамадзян.

8. Абласным, Мінскаму гарадскому, раённым, гарадскім выканаўчым камітэтам, Міністэрству транспарту і камунікацый выдзеліць органам унутраных спраў для размяшчэння ўчасткаў міліцыі грамадскай бяспекі, участкаў дарожнай і транспартнай міліцыі памяшканні і маёмасць для іх абсталявання.

9. Увесці з 1 студзеня 1995 г. у Рэспубліцы Беларусь улік сродкаў каляровага капіравання (аператыўнай паліграфіі, капіравальна-размнажальнай тэхнікі, кропельна-струменных прынтэраў і інш.), набываемых грамадзянамі, а таксама прадпрыемствамі, арганізацыямі і установамі, незалежна ад форм уласнасці і сфер дзейнасці.

Фізічным і юрыдычным асобам да 30 студзеня 1995 г. зарэгістраваць у органах унутраных спраў ранейшыя набытыя такія сродкі.

Міністэрству ўнутраных спраў з удзелам Міністэрства юстыцыі і Камітэта дзяржаўнай бяспекі ў месячны тэрмін распрацаваць і зацвердзіць правілы набыцця, уліку, захоўвання і выкарыстання ў Рэспубліцы Беларусь сродкаў каляровага капіравання і падрыхтаваць прапановы аб увядзенні адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне гэтых правіл для ўнясення ва ўстаноўленым парадку ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.

10. Міністэрству ўнутраных спраў да 1 сакавіка 1995 г. забяспечыць перарэгістрацыю наразной агнястрэльнай зброі і праверку абгрунтаванасці набыцця яе грамадзянамі.

11. Дзяржаўнаму мытнаму камітэту, Галоўнаму ўпраўленню пагранічных войскаў прыняць дадатковыя меры для недапушчэння незаконнага вывазу за мяжу тавараў, сыравіны і матэрыялаў.

12. Міністэрству ўнутраных спраў сумесна з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі, Галоўным упраўленнем пагранічных войскаў, Дзяржаўным мытным камітэтам, органамі выканаўчай улады і з удзелам пракуратуры ажыццяўляць аперацыі па выяўленню і спыненню злачынных фарміраванняў, карупцыі, кантрабанды, незаконнага абароту наркатычных сродкаў.

13. Міністэрству абароны накіроўваць Міністэрству ўнутраных спраў ваеннаслужачых і неабходную колькасць транспартных сродкаў для аказання дапамогі ў забеспячэнні грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю, правядзенні буйнамаштабных аперацый і патруляванні.

14. Міністэрству культуры і друку, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, Упраўленню грамадска-палітычнай інфармацыі адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь арганізаваць асвятленне ў сродках масавай інфармацыі правядзімай у рэспубліцы работы па абароне правоў, свабод, жыцця, здароўя і маёмасных інтарэсаў грамадзян, барацьбе са злачыннасцю, рэфармаванню мясцовага кіравання і самакіравання, выхаду рэспублікі з крызісу.

15. Гэты ўказ уступае ў сілу з дня яго апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.
27 снежня 1994 г. г.Мінск.

"Уорлднэт"

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

Дзяжурныя па выпуску перакладчыкі Ларыса ДУДАРУК, Людміла КАХАВЕЦ, рэдактар Наталля ВАЛАКІДА.

ЖУРНАЛІСТЫ – НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

Міжнародная федэрацыя журналістаў паведаміла, што ў гэтым годзе было забіта каля 15 журналістаў.

Самай маладой ахвярай стала нядаўна 24-гадовая амерыканка Сінція Эльбаўм, якая трапіла пад бомбавы налёт у Грозным. У Руандзе загінулі 48 журналістаў, у Алжыры — 19.

КАРАЛЕЎСКІ АГЛЯД

Англійская каралева Елізавета II падвяла вынікі мінулага года ў сваёй прамове па тэлебачанні.

Яна адзначыла, што ў 1994 годзе пачало стабілізавацца становішча ў такіх краінах, як Расія, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка і Паўночная Ірландыя. Найважнейшымі падзеямі мінулага года каралева назвала святкаванне 50-годдзя высадкі саюзных войскаў у Нарманды, а такcама сваю паездку ў Расію, якая, па яе словах, з'яўляецца адзнакай новай эры ва ўзаемасувязях краін.

"Суперчэннэл"

ДЭМАКРАТЫ ПАДЛІЧАНЫ

Арганізацыя "Freedom House" ў Вашынгтоне, якая займаецца дзейнасцю па абароне правоў, напрыканцы года падлічыла колькасць дэмакратычных краін у свеце.

Паводле яе звесткам, зараз іх 114 — у два разы болей, чым два гады таму. Гэтым годам дэмакратычнымі сталі 7 дзяржаў: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Гаіці, Украіна, Мазамбік, Малаві, Гвінея-Бісаў і Палау.

"ЗАСУМАВАЎ" ПА ПРЭЗІДЭНЦЕ

Ахова Белага дома затрымала на даверанай ёй тэрыторыі парушальніка.

Пры бліжэйшым знаёмстве супрацоўнікі сакрэтных службаў былі азадачаны яго адказам. Парушальнік растлумачыў свой учынак тым, што яму "проста захацелася пабачыцца з прэзідэнтам".

"Еўраньюс"

МОЎНАЕ НЕПАРАЗУМЕННЕ

На нядаўняй сустрэчы ў Будапешце ўдзельнікі Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ) вырашылі перайменаваць ў Арганізацыю за бяспеку і супрацоўніцтва ў Еўропе (АБСЕ).

І выклікалі перапуд сярод мальтыйскай дэлегацыі. Высветлілася, што новае скарачэнне АБСЕ на іх мове — "чорная" лаянка. Але нягледзячы на моўныя неадпаведнасці, удзельнікі нарады ўсё ж пераканалі палітыкаў Мальты прыняць у свой моўны лексікон гэта "лаянкавае" слова.

ААН ПАШЫРАЕЦЦА

Архіпелаг Палау стаў 185-м членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Ён размяшчаецца ў 800 км ад Філіпін у паўднёва-ўсходнім накірунку і складаецца з 200 астравоў. Насельніцтва архіпелага — 16 тысяч чалавек. З 1914 года Палау знаходзіўся пад кіраўніцтвам Японіі, пасля 1944 года — пад уладай ЗША. Сваю незалежнасць ён абвясціў 1 кастрычніка гэтага года.

"TV-5"

У ПНЕЎМАТЫЧНАЙ ПОШТЫ – ЮБІЛЕЙ

Пнеўматычнай пошце ў Празе спаўняецца ў 1995 годзе 90 гадоў.

І да сённяшняга часу яна карыстаецца ў гараджан папулярнасцю. Падземная траса працягваецца на 60 км, а пісьмы і газеты ляцяць па трубах з хуткасцю 70 і болей кіламетраў у гадзіну. Паслугамі пнеўматычнай пошты карыстаюцца зараз у Празе каля 50 устаноў і арганізацый.

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

КУР'ЕР "ЧЗ"

ПАЛІТЫЧНЫЯ ХВАЛІ 1995-ГА

Змяненні ў заканадаўстве, відаць, моцна ўзрушылі грамадскія арганізацыі рэспублікі. Як паведаміў начальнік упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Міхаіл Сухінін, большасць з іх да 1 красавіка 1995 года павінна перарэгістравацца. А паколькі неабходныя для гэтай працэдуры дакументы трэба здаць у міністэрства хоць бы за месяц, то, відаць, хваля сходаў, з'ездаў і іншых форумаў захлісне рэспубліку ўжо з самага пачатку будучага года.

Новае заканадаўства прадугледжвае таксама магчымасць грамадскім аб'яднанням ствараць гасразліковыя арганізацыі. Атрымаўшы ліцэнзію на які-небудзь від дзейнасці, яны такім чынам змогуць зарабляць на жыццё.

КАМУ МЯСА, А КАМУ...

Не зусім звычайна па цяперашнім часе сюрпрыз паднёс заможным мазыранам і гасцям горада калектыў эксперыментальнай базы "Крынічная".

За навагоднім сталом, як вядома па ўсходняму календары, прысвечаным году Свінні, у Мазыры змогуць паласавацца вэнджанай парасяцінай. Шкада толькі, што пры цяперашняй беднасці многім прыйдзецца сустракаць Новы год увогуле без мяса.

БЕЛІНФАРМ.

ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК – ГЭТА... БУЛЬБА

Докшыцкі гарсавет і мясцовы райсельгасхарч вырашылі забяспечыць бульбаю ўсіх, хто мае ў ёй асабліва вострую патрэбу... бясплатна. Бульбу завезлі з саўгаса "Вітунічы" — гаспадаркі заможнай.

Цікава, што гэтая дабрачынная акцыя ў раёне не адзінкавая. Некаторыя гаспадаркі бясплатна забяспечваюць малаком знямоглых і састарэлых, аказваюць ім паслугі.

Уладзімір МІХНО.

"...А ТРЭБА ЖЫЦЬ"

У мінскім Доме літаратара адбылася ўрачыстая перадкалядная вечарына–сустрэча з "перасяленцамі" з чарнобыльскай зоны.

Усім вядома, колькі няшчасця і гора прынесла беларускаму народу аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Выбух амаль дзесяцігадовай даўніны забрудзіў радыенуклідамі трэць тэрыторыі нашай краіны. Яго вынікі па-ранейшаму даюць аб сабе знаць. У некаторых раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей немагчыма жыць, таму людзі ехалі і едуць адтуль, а гэта ў цяжкай эканамічнай сітуацыі складана ўдвая. Але выступаючыя акцэнтавалі ўвагу на мужнасці, стойкасці, памяркоўнасці беларусаў. Заклікалі да шанавання сваёй гісторыі, культуры, роднай мовы. Затым была музычна-паэтычная частка з удзелам вядомых майстроў мастацтва, паэтаў і пісьменнікаў, фальклорных ансамбляў.

Вечарына, арганізатарамі якой выступілі Беларуская асацыяцыя чарнобыльскіх арганізацый "26 красавіка" і Беларускі фонд славянскай пісьменнасці і культуры, прыцягнула ўвагу прадстаўнікоў замежных амбасадаў, лідэраў беларускіх палітычных партый і рухаў.

Уладзімір СТАРАСЦЕНКА.

Вучымся палоць дзяржаўны агарод

Як заўжды, калі надыходзіць час паглядзець на штосьці здалёк, каб убачыць вялікую дэталь малюнка, трэба адысці ад яго — і тады даволі многа чаго робіцца зразумелым.

Цікавы быў гэты год на Беларусі, можа самы цікавы з тых чатырох, на працягу якіх мы маем незалежнасць. Як у любым дэмакратычным грамадстве, павінен змяняцца час ад часу ўрад, парламент. Бо нават і каралева, дай ёй бог здароўя, бывае адыходзіць у іншы свет. Здарылася, прыйшла за незалежнасцю і дэмакратыя на Беларусь (бо неабавязкова абедзве разам ходзяць), і ўпершыню ў гісторыі адбыліся выбары першага Прэзідэнта. Пішу гэтыя радкі і ўспамінаю, як сустракаўся з ім пад час невялікай камандзіроўкі ў Мінск ў жніўні гэтага года. Самае галоўнае, што я зразумеў — гэты чалавек ведае, што ён павінен зрабіць, каб лепш было на Беларусі не толькі з эканамічнага боку, але каб і палітычна мы адчувалі, што змены ёсць. Як гэта ўжо недзе было, бо гісторыя паўтараецца, парламент Беларусі, які быў абраны яшчэ з савецкіх часоў, не жадае падпарадкоўвацца пэўным прэзідэнцкім структурам, бо зразумела, што да гэтага часу на раёне кіравалі саветы. Быццам сёння не 1994 год. Нічога, без крыку і ляманту будуць арганізаваны і выбары, і збярэцца новы Парламент (а не Вярхоўны Савет), але гэта ўжо будзе ў наступным годзе.

На Беларусь прыйшлі змены ў гэтым годзе, і змены радыкальныя. Зразумела, што калі не працуеш у агародчыку, то трава заб'е і буракі, і моркву. Калі ў дзяржаве не рабіць змен, то тады палоць дзяржаўны агарод даволі цяжка, бо трава вырастае вялікая. Але цяжка навесці парадак за некалькі месяцаў, калі нічога не рабілася на працягу чатырох год. Што ж, лепш позна чым ніколі.

Эканамічна Беларусь пакуль не адчувае вялікага пад'ёму, бо краіна заўжды была "цэхам зборкі" вялікага саюза, куды прывозілі метал ды сыравіну, а потым забіралі гатовыя станкі, БелАЗы, МАЗы ці электроніку. Паколькі эканамічны крызіс трэба перажываць не толькі нам, але і іншым краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, то канкурэнцыя на рынках даволі вялікая. Але не з пустымі ж рукамі мы на іх выходзім — маем недзе 40 працэнтаў вытворчасці электронікі былога Саюза, а калійных угнаенняў — больш за палову. З Брытаніяй маем пагадненне аб эканамічным супрацоўніцтве — во куды трэба выходзіць і з кім таргаваць.

Што датычыць пасольства Беларусі ў Вялікабрытаніі, то мы перажылі пад'ём у траўні гэтага года, калі прыехаў пасол У.Сянько, але праз тры месяцы ён заняў пост міністра замежных спраў і зараз мы чакаем другога чалавека на гэты пост. У хуткім часе абяцалі, што прыедзе.

А з апошніх навін самая цікавая аб тым, якую паведаміў брытанцам пад час свайго візіту ў гэту краіну міністр абароны А.Кастэнка — у хуткім часе Беларусь далучыцца да Праграмы НАТО "Партнёрства дзеля міру", толькі трэба спачатку вызначыцца дасканала па якіх накірунках мы жадаем з НАТО супрацоўнічаць.

Звычайна, што трэба падвесці рысу перад тым, як пачынаеш новы радок, мяркую, што новы радок у гісторыі Беларусі пачаўся, а пад старым пастаўлена рыса.

Алег ЯКАВІЦКІ,
консул Беларусі ў Лондане.

Свята па-амерыканску

Салата з капусты, нават пад соусам Анкл Бэнс,- гэта Вам не парася з хрэнам.

Мінулы год, 1994-ы, мінчанка Юлія Міневіч, сустракала ў Амерыцы. Трапіла яна туды, як сама кажа, выпадкова. Сапраўды, шчаслівая выпадковасць: паспяхова вытрымала складаныя тэсты для старшакласнікаў на англійскай мове, якія праводзяць амерыканцы пад дэвізам "Акт у падтрымку свабоды" і адправілася на цэлы год на вучобу ў Штаты. Але размова ў нас з Юляй зараз будзе не пра гэта, а пра "тое". Як там, за акіянам, Новы год сустракаюць, што ядуць, што п'юць, якія падарункі дораць?

— Якраз сам Новы год, навагодняя ноч, у іх вялікім святам не лічыцца. Звычайна сям'я даседжвае да дванаццаці гадзін ночы, выпіваюць шампанскае і ідуць спаць. Сапраўднае ўрачыстае свята — гэта Ражство — самае вялікае свята ў годзе, якое спраўляюць у ноч з 24 на 25 снежня.

Я жыла ў сям'і з трох чалавек: гаспадар, яго завуць Пол Пітры, ён дызайнер, яго жонка Сьюзен, іх дачка Крысцін шасці гадоў. 24 снежня вечарам мы пайшлі ў рэстаран разам з малой. Там толькі лёгкая закуска, напіткі, дэсерт. Вярнуліся дамоў яшчэ да поўначы, мы з Крысцін гулялі каля ёлкі, потым разышліся па сваіх пакоях быццам бы спаць, а на самай справе, таямніча, у цемнаце прабіраліся да ёлкі, каб параскладваць там падарункі. Крысцін прачнулася гадзін у пяць раніцы, ледзьве дачакалася падарункаў ад Санта-Клаўса. Выцягнула з-пад ёлкі вялізны самакат, запакаваны ў бліскучую празрыстую паперу. Розную падарункавую драбязу, цацкі, цукеркі яны раскладваюць па мяшках у выглядзе вялізных панчохаў. Такіх панчохаў пад ёлкай было чатыры, на кожнага члена сям'і.

— А што падарылі табе?

— Электронную гульню, світэр, вось ён цяпер на мне, гадзіннік — таксама нашу, завушніцы са срэбра. А тую драбязу, што ляжала ў панчосе і не пералічыць!

Пол падарыў Сьюзен відэакамеру, а яна яму — старажытную антыкварную кніжку, у мінулым стагоддзі, надрукаваную, вельмі дарагую. Ён аматар такіх рэчаў. Амерыканцы наогул любяць рабіць прыемнае сваімі падарункамі, купляюць іх з задавальненнем.

— У нас падрыхтоўка да Новага года таксама звязана з набыццём падарункаў, але гэта, на жаль, часта ператвараецца ў непрыемную справу, якая вымотвае нервы, забірае шмат часу. А яшчэ ж трэба купіць прадукты, прыбраць кватэру... А ў іх, як з гэтым?

— Я і сама дзівілася, чаму ў іх няма таго вэрхалу, які бывае ў нас у кватэры пад час генеральнай уборкі. Вільготная ўборка пылу з дываноў, паліц пыласосам — і ўсё блішчыць! Ну, а за прадуктамі, самі ведаеце, у чарзе стаяць не трэба.

Што ў іх сапраўды займала многа часу — гэта ўпрыгожванне дома і самой ёлкі. Ёлка ў нас была высокая, да самай столі, густа абвешаная цацкамі і бліскучай мішурой, такія ж упрыгожанні на вокнах, пад столлю. Мы цэлы тыдзень займаліся гэтым.

— Ну, давай, нарэшце, пяройдзем да святочнага стала. Пад чым ён там "ломіцца"?

— О, баюся расчараваць, ён не "ламаўся". 25 снежня пад вечар да нас прыйшлі госці і мы запрасілі іх за стол. Сьюзен для гэтай нагоды спецыяльна купіла сталовы сервіз—навагодні, у блакітных узорах. На блюдзе ляжала рэзаная на порцыі курыца, была яшчэ салата з агародніны і чыпсы, якія яны ядуць, макаючы ў соусы. А соусаў было тры-чатыры, на выбар.

— Ну, зразумела, з соусам Анкэл Бэнс. А салата — з кавалачкам ананаса?

— Ой, зноў не! З капусты! Робіцца яна так: зялёны ліст капусты шчыпаецца (менавіта так, не рэжацца!), потым да капусты дадаюць парэзаныя тонкімі скрылікамі памідоры і цыбулю. І больш ніякага дзіва. Прычым, салата нічым не запраўляецца.

Таму што на стале зноў стаяць на выбар некалькі прыпраў.

— Ну, а мясное асарці: каўбаса там, бужаніна...

— Адсутнічае! На Новы год з мяса, праўда, былі толькі смажаныя свіныя рабрынкі-ружовенькія, мініяцюрныя, — і елі мы іх з ... яблычным пюрэ. Смачна!

— Амерыканцы яшчэ п'юць прыгожа... — Так, напіткаў у іх многа. Шампанскае п'юць толькі на Новы год. А так — розныя віны абавязкова кока-кола, сокі. Яны не сядзяць доўга за сталом. Паелі — і адышлі, селі на канапы, крэслы, з фужэрамі ў руках, размаўляюць, смяюцца. Тэма размоў — не палітыка і не работа — хто дзе адпачываў, якія поспехі прынёс адыходзячы год.

У сябе дома я, звычайна, сустрэну Новы год з бацькамі, а потым іду да сяброў, дзе і гуляем да раніцы. А амерыканцы пасядзяць трошкі і спаць ідуць. Што зробіш, няма ў іх "Навагодняга агеньчыка" па тэлевізары. (Смяецца).

— Што яшчэ найбольш незвычайнае ў сустрэчы Новага года ў Амерыцы табе запомнілася?

— Незвычайным, напэўна, можна назваць тое, што ёлкі ў штаце Каліфорнія, у горадзе Сан-Дыега, дзе я жыла, стаяць на вуліцах не прыцярушаныя снегам, на зялёных газонах. Дзесяць градусаў цяпла — ніжэйшая тэмпература, якая там была. Выйсці ў навагодную ноч на вуліцу не ў футры, а ў світэры — гэта незвычайна!

Лілія КРАПІВІНА.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Рыхтуючы навагоднюю падборку чытацкіх пісьмаў, мы вырашылі не выбіраць спецыяльна тыя, якія б былі прысвечаны толькі святу. У гэтых допісах — розных па сваёй тэматыцы — думкі людзей, з якімі яны жылі гэты год. Такіх лістоў у рэдакцыі не адзінкі. А таму, мяркуем, у сённяшняй "Паштовай скрынцы" адлюстравана пэўная палітра пачуццяў, эмоцый і надзей грамадства.

Аддзел пісьмаў і вывучэння грамадскай думкі.

СІМВАЛЫ – НЕ ПАЛЬЧАТКІ

Хачу выказаць сваю думку наконт спроб перагляду нашай дзяржаўнай сімволікі.

У апошні час рэваншысцкія сілы актывізавалі свае дзеянні з мэтай ліквідацыі суверэнітэта Беларусі, адраджэння камуністычнай імперыі. Такія спробы могуць прывесці да канфрантацыі ў грамадстве, падарваць прэстыж Беларусі на міжнароднай арэне. Што гэта за дзяржава, якая мяняе сімвалы, як пальчаткі?!

Бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" адпавядаюць усім законам геральдыкі, блізкія па свайму зместу і структуры еўрапейскім традыцыям дзяржаўнай сімволікі.

Сцяг БССР, прыняты ў 1956 годзе, не мае пад сабой гістарычнага значэння. Герб жа БССР, які нам спрабуюць вярнуць, і зусім не мае ніякіх беларускіх каранёў і асаблівасцей, бо з'яўляецца бляклай копіяй герба былога СССР.

Расія вярнула гістарычную сімволіку — андрэеўскі бела-лазараўскі сцяг, нягледзячы на тое, што можна па рознаму ацаніць дзейнасць РВА (Расійскай Вызваленчай Арміі) генерала Уласава, якая ў гады Другой сусветнай вайны ваявала пад гэтым сцягам на баку Германіі. Як і Украіна, яна прыняла "жоўта-блакітны" сцяг і герб — трызубец.

Гістарычную сімволіку заўсёды спрабавалі скарыстоўваць у сваіх мэтах розныя сілы, але гэта не павінна закрэсліваць яе значэнне і змест.

Тыя сілы, на якіх ляжыць гістарычная адказнасць за разбурэнне старажытнай часткі Мінска, як і іншых беларускіх гарадоў, вёсак і мястэчак, за знішчэнне цэркваў, касцёлаў, сінагог і іншай культурнай спадчыны нашай краіны, што сцірала памяць пра выдатных сыноў яе — Шагала, Касцюшку і інш. (быў знішчаны "маёнтак" апошняга), тыя, хто давёў краіну ў цэнтры Еўропы да ўзроўню "абязлічанай" правінцыі, цяпер робяць замах на дзяржаўную сімволіку нашай шматпакутнай краіны.

Сяргей НОСАЎ,
прэс-сакратар Партыі Падтрымкі СНД.

БОЙЦЕСЯ КАНЬЯКУ І ТАМПОНАЎ

Здавалася б, што агульнага паміж пікантным таварам для жанчын і высакародным алкагольным напіткам? На Захадзе ды, думаецца, і ва ўсім астатнім свеце справядліва лічаць, што нічога агульнага паміж імі няма. Але ў краінах СНД, у тым ліку і Беларусі, спажыўцам трэба асцерагацца і таго, і другога. Праўда, па розных прычынах. Справа ў тым, што маскоўскі віназавод "Самтрэст", які дзесяцігоддзямі спецыялізаваўся на вытворчасці грузінскіх спіртных напіткаў, цяпер разлівае толькі дзве маркі грузінскіх вінаў: "Мукузані" і "Цінандалі", а за разліў каньяку наогул не бярэцца ўжо даўно. Так што самтрэстаўскіх каньякоў, ды яшчэ нядаўняга разліву, наогул у прыродзе не існуе. Але дастаткова прайсці па гандлёвых кропках Мінска, дзе прадаюць спіртное, і без цяжкасці можна знайсці некалькі гатункаў самтрэстаўскага грузінскага каньяку. У самым лепшым выпадку, гэта разбаўлены каньячны спірт і нічога больш. Такім хоць не атруцішся, і то добра, але адразу адчуеш пры ўжыванні рэзкі спіртавы смак і пах, чаго ў сапраўднага каньяку няма. Звычайна моцнасць гэтага сурагату 33-35 працэнтаў, а зусім не 42-43 працэнты, як належыць вытрыманым грузінскім каньякам тыпу "Юбілейны". Але намнога часцей гэтае пойла гатуюць наогул немаведама дзе з нізкагатункавых спіртаў, накшталт чачы, а то і самагону. Тут зусім проста атруціцца.

Каб не памыліцца і не заплаціць шалёныя грошы за атруту, трэба ведаць наступнае: корак фірменнага каньяку вырабляецца з пластмасы і загортваецца ў фальгу, акрамя таго, ніжні край корка выступае з-пад металічнай акантоўкі на 7-10 мм і добра бачны скрозь рыльца бутэлькі, на верхняй частцы дрэнна закрытага корка выразна адціснуты надпіс "Самтрэст". Этыкетка ў каньякоў самтрэстаўскага разліву прыклеена роўна, на яе адваротным баку скрозь бутэльку добра відаць ліловая пячатка з датай вырабу, якая цяпер можа быць толькі даўняй.

Дзякуючы рэкламе, такі спецыфічны тавар, як тампон "Тампакс", набыў шырокую вядомасць. Нямногім уступае яму ў гэтых адносінах тампон "ОБ". Але ні ў адной іх рэкламе па нашым тэлебачанні няма нават і намёку, што з сакавіка 1994 года ўсе вытворцы жаночых тампонаў абавязаны змяшчаць на ўпакоўках папярэджанне аб магчымых выніках іх прымянення. А яны, паводле даных заходніх медыкаў, вельмі сур'ёзныя. Тампоны гэтыя могуць выклікасць сіндром таксічнага шоку. Павысіцца да 39 тэмпература, будзе ванітаваць, можа з'явіцца сып, забаліць горла, пачнецца моцнае галавакружэнне, а потым можа і смерць настаць. Усе гэтыя непрыемнасці нясе бактэрыя "стафілакок залацісты". Упадаць у паніку, зрэшты, не трэба. У Вялікабрытаніі, дзе гэтыя тампоны таксама папулярныя, у год захворваюць толькі каля 20 жанчын — працэнт, як бачым, зусім невялікі. Але не думаю, што хто-небудзь з мільёнаў згодзіцца апынуцца на месцы адной з гэтых дваццаці.

Барыс САФРОНЕНКА.

ПРОСЬБА АБ ДАПАМОЗЕ

ДАРАГАЯ РЭДАКЦЫЯ!

Звяртаюся да вас па дапамогу.

Я пераехала на новую кватэру, і цяпер у мяне няма самага неабходнага — халадзільніка. Няма і грошай, каб яго набыць. Хачу звярнуцца праз газету да чытачоў: мо, знойдзецца спонсар? Калі ласка, спадары, дапамажыце! Бацькі мае — пенсіянеры, усе грошы ідуць на аплату кватэры, тэлефона, электраэнергіі, харчавання. Сабраць два мільёны — немагчыма. Хіба што па нешматлікіх знаёмых. Але не кожны дасць больш як 5 тысяч...

Зараз зіма, і пакуль што жыць можна. Але калі прыйдзе лета...

З надзеяй Л.ШУГАЕВА.

ЯК ЖЫВЕШ,СТУДЭНТ ?

Свята, якое заўсёды з табой, — гэта Новы год і КВЗ. Так вырашылі арганізатары і ўдзельнікі фіналу турніру КВЗ, які праводзіўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. І вечар сапраўды атрымаўся. Ён быў па-навагодняму святочным, а гумар і жарты не былі ў дэфіцыце. За званне пераможца ў турніры сезона 1994 года змагаліся каманды КВЗ філасофска-эканамічнага і геаграфічнага факультэтаў.

Госцем фіналу КВЗ была каманда БДУ, якая дзякуючы спонсарам — навукова-вытворчаму прадпрыемству "АТЭКС" — неаднаразова прымала ўдзел у выступленнях клуба вясёлых і знаходлівых на "Астанкіна". Удзельнікі каманды не толькі добра жартавалі, але яшчэ на радасць гледачам даравалі сусрэчу з папулярнымі артыстамі і вядомымі палітычнымі дзеячамі. Пераможцай стала каманда ФЭФа і атрымала прызы рэктарата, прафкама студэнтаў, ад спонсара ТАА-Аўтамотарс, спецыяльныя прызы ад студэнцкага клуба і каманд КВЗ БДУ.

Фота Жанны МАЁРАВАЙ.

ЛЕКАРКА

Масавая цікаўнасць, якая ахапіла наша грамадства гадоў пяць таму і вынесла на грэбень славы ледзь не ў якасці нацыянальных герояў Алана Чумака і Анатоля Кашпіроўскага, здаецца, прайшла. Але праблемы, якія нарадзіла гэтая з'ява, як і чалавечыя недамаганні і хваробы — засталіся. На што спадзяваецца цяпер: на сябе, на традыцыйную медыцыну, на цуд?

"На ўсё патрошкі", — сказала б, напэўна, Зінаіда Васільеўна Макарская. Вы з ёй яшчэ не знаёмы? Калі не — то, напэўна, хоць бы чулі. Так-так, тая самая масажыстка з заводскага медыцынскага цэнтра. Прадстаўніца звычайнай прафесіі. Але пра такіх кажуць — майстар высокага класа. Да таго ж, і чалавек яна проста дзіўны.

...Я адшукаў яе на шостым паверсе. Быў вечар. Не пазімоваму слотны вечар, у які так хочацца хоць бы крыху цяпла, як і чыёй-небудзь заклапочанасці, увагі... Дарэчы, прамерзлыя наведвальнікі, якія цярпліва чакалі сваёй чаргі, каб зайсці ў пакой да Макарскай, наўрад ці ўсведамлялі гэта. У кожнага ў яго медыцынскай картцы чорным па беламу значыўся канкрэтны дыягназ, і кожны спадзяваўся толькі на вылечную сілу яе рук.

А вярнула яна здароўе многім. Асабіста мне з удзячнасцю расказаў пра яе даўні знаёмы, які шмат гадоў мучыўся радыкулітам. Пасля сеансаў тэрапіі ў Макарскай, хваробу ў яго як рукой зняло. Яшчэ і не мог зразумець: маўляў, гэта — звычайны масаж...

Вось тут і патрабуецца ўдакладненне. Масаж у Макарскай не зусім звычайны. Я, праўда, не спецыяліст, але, думаецца, што звычайны школьны сшытак, увесь спісаны словамі ўдзячнасці яе кліентаў — лішняе таму пацверджанне.

Хоць, калі ўжо быць зусім дакладным, то, відаць, справа ў дыпломе. Не, не ў тым, першым у яе жыцці дыпломе інжынера, які яна атрымала ў свой час пасля заканчэння аднаго з тэхнічных ВНУ. То была, як цяпер відаць, памылка. Няправільны крок на шляху да адзіна правільнай мэты. А яна ў тым, каб дапамагаць іншым. Рабіць гэта кваліфікавана ёй дапамаглі ў Інстытуце праблем чалавека і народнай медыцыны. Менавіта там яна набыла веды па асновам акупунктурнага лячэння, медыцынскай псіхалогіі і парапсіхалогіі, агульнаму, сегментарнаму і бескантактнаму масажам, біяэнергатэрапіі, дыхальнай гімнастыцы, разгрузачна-дыетычнай тэрапіі. З дапамогай курсаў набыла яна кваліфікацыю псіхолага-біяэнергатэрапеўта. Як бачыце, сама назва атрыманай спецыяльнасці вельмі абавязвае. Да чаго? Да таго, вядома, каб перад вамі быў не проста чалавек у белым халаце, знаўца фізіялогіі, але і часткова — "інжынер душы" (як ні банальна гэта гучыць), а яшчэ трошкі — чараўнік і хірамант (у добрым сэнсе гэтага слова). Таму што слова таксама лечыць. Таму што немагчыма змагацца з хваробай цялесной, калі надламана душа. А яшчэ таму, што ўсе мы сёння знаходзімся ў стане людзей, якія перажываюць катастрофу. Тую эканамічную і сацыяльную катастрофу, якая пакінула пасля сябе шматлікія фобіі, пачуццё прыгнечанасці, страху, апатыі... Пасеяла агрэсіўнасць, падазронасць, недавер. А крызіс духу — ён куды больш небяспечны за канкрэтную чалавечую бядлячку. У гэтым упэўнена і яна, Зінаіда Макарская. І, як можа, спрабуе дапамагчы кожнаму са сваіх пацыентаў зірнуць на свет вакол сябе і на сваё месца ў гэтым свеце з іншага, у адрозненне ад звычайнага, пункту гледжання. Магчыма, недаверлівы буркун, цвёрдакаменны матэрыяліст назваў бы яе дзівачкай. Слова гонару, яна ад гэтага не засмуціцца. Таму што для яе больш аўтарытэтныя зусім іншыя словы. Напрыклад, у адной выдатнай кнізе, "Споведзь" Русо (удакладніла яна), ёсць такая думка: "Тое, што нам прыходзіцца рабіць, у многім залежыць ад таго, у што нам прыходзіцца верыць".

Згодзімся і мы: вера — вылечвае. І лечыць. Гэтаму феномену можна даць навуковае тлумачэнне: вызваленне ўнутраных рэсурсаў арганізма садзейнічае паляпшэнню агульнага самаадчування. Так ці прыкладна так растлумачыла мне гэта сама Макарская.

Хоць, вядома, ніякіх звычайных цудаў яна нікому не абяцае. Ніякіх нерэальных перспектыў не малюе. Проста робіць сваю справу. І ад пацыентаў, што называецца, адбою няма.

Факт гэты, калі не прымаць да ўвагі рэпутацыю самой Макарскай, дастаткова сумны. Паглядзіш вакол — такое ўражанне, што рэдка які-небудзь чалавек чым-небудзь не пакутуе. Ці падзяляе такую думку Зінаіда Васільеўна?

Толькі часткова. Па натуры яна, як мне падалося, усё ж аптыміст. І як усякі чалавек, не пазбаўлена звычайнага пачуцця гумару. "Памятаеце, — пытае яна ў мяне, — адзін з персанажаў Джэрома, адкрыўшы медыцынскую энцыклапедыю, знайшоў у сабе сімптомы ўсіх пералічаных у ёй хвароб, акрамя родавай гарачкі, паколькі быў мужчынам. Наогул, чалавек часта бывае падобны з гэтым літаратурным персанажам. Ён або нічым не хварэе, або абсалютна ўсім. І таму прычыну для таго, каб звярнуцца да ўрача ці лекара можна знайсці без праблем. Праблема ў тым, да каго пайсці..."

Усё правільна. Да каго — гэта часта пытанне з пытанняў. Для тых, хто знаёмы з Макарскай, яно адпадае само па сабе. Хоць, відавочна, мала хто можа сказаць, што ж у гэтай жанчыне галоўнае: яе лекарскія рукі ці яе дзіўная душа...

Адным з вынікаў напружанай працы гэтай вечнай субстанцыі — вершы. Вершы не медыка, а проста жанчыны. Проста чалавека. Аб чым? Аб жыцці. Аб сваіх адносінах да яго. У іх — і жывая памяць перажытага, і вострая рэакцыя на падзеі, і спроба прадказаць будучае. Якім яно будзе для яе? Для ўсіх нас?

Так хочацца верыць: усё будзе добра...

Іра ЯКАЎЛЕВА,
студэнтка журфака Белдзяржуніверсітэта.

КУР'ЕР "ЧЗ"

Сюрпрыз на экране

Адным з навагодніх сюрпрызаў экрана рэспублікі абяцае стаць фільм "Тры мушкецёры".

Гэта новая кінаверсія папулярнага рамана Аляксандра Дзюма створана ў мінулым годзе ў кінакампаніі Уолта Дыснея. Новыя "Тры мушкецёры" прадставяць адразу пяць маладых "зорак" амерыканскага кінематографа. У ролі Д'Артаньяна тут зняты дваццацітрохгадовы акцёр Крыс О'Донэл, вядомы па карціне "Водар кахання". У вобраз Араміса ўжыўся Чарлі Шын, Партоса іграе Олівер Плат.

У госці да сірот

Калядная свята для дзяцей-сірот прайшло ў Дулебскім дзіцячым доме, размешчаным у Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці.

Арганізатарамі яго сталі Цэнтральны Камітэт Саюза моладзі Беларусі, беларускі фонд дапамогі дзецям-сіротам "Надзея" і амерыканская Асацыяцыя цэркваў веры і служэнняў. Прадстаўнікі гэтых грамадскіх арганізацый, якія прыбылі ў госці да малышоў, прывезлі з сабой не толькі калядныя падарункі. Выхаванцы дзіцячага дома сталі сведкамі сапраўднага навагодняга шоу-прадстаўлення, якое для іх падрыхтавалі госці.

Падарункі для ўсіх

180 вучняў Мінскай школы для глухіх дзяцей атрымаюць калядныя падарункі ад Дзеда Мароза.

Ролю гэтага казачнага героя вырашылі выканаць прадстаўнікі Камітэта па справах моладзі. Акрамя таго, аб добрых справах гэтай арганізацыі даведаюцца і хворыя дзеці, якія знаходзяцца на лячэнні ў Рэспубліканскім дзіцячым анкалагічным цэнтры ў Бараўлянах. Гэтых малышоў таксама чакаюць падарункі і ласункі.

БЕЛІНФАРМ.

Дзед Мароз з Нямеччыны

Без каляднага падарунка не застаўся ніводны юны жыхар калгаса "Нёман" Стаўбцоўскага раёна. У ролі шчодрага Дзеда Мароза тут выступіў Ханс Вернер Мэрс, які прадстаўляе нямецкі дабрачынны фонд "Дапамога пацярпеўшым дзецям". Ён створаны ў горадзе Хатынгене.

Акрамя ласункаў і цацак, сярод навагодніх падарункаў знайшлося месца для адзення і абутку. Сёе-тое з гэтага дабрачыннага грузу дасталася і мясцовым старым, малазабяспечаным людзям. Асаблівыя пасылкі з пісьмамі, малюнкамі і фотаздымкамі атрымалі першакласнікі тутэйшай школы ад сваіх нямецкіх равеснікаў, якія прапанавалі ім перапісвацца і сябраваць.

Ханс Вернер Мэрс не першы раз прыязджае ў нашу рэспубліку з падарункамі. Яго цяперашні калядны маршрут у Беларусі не абмяжоўваўся калгасам "Нёман". Частка падарункаў будзе перададзена сем'ям, што перасяліліся ў Стаўбцоўскі раён з забруджанай радыяцыяй зоны, пацыентам райбальніцы. Ёсць некалькі адрасоў і ў Мінску — дзіцячае уралагічнае аддзяленне 4-й гарадской клінічнай бальніцы, трэці дзіцячы дом, шэраг дзіцячых садкоў.

Святлана КУЛІКОВА.

Новы сябар у навагодні круг

Магілёўскі абласны камітэт Саюза Моладзі Беларусі сумесна з упраўленнем адукацыі аблвыканкама праводзіць напярэдадні Новага года свята для старшакласнікаў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў. У праграме свята былі сустрэчы з бардамі, дзіцячым калектывам Палаца піянераў і школьнікаў "Вясёлка". На іх для старшакласнікаў быў арганізаваны салодкі стол, уручаны калядныя падарункі, прайшлі музычныя шоу-праграмы "Новы сябар у навагодні круг".

Майя ШЭНДРЫК.

Лаўрэаты спартыўнага года

Пальму першынства сярод беларускіх спартсменаў сёлета заваяваў абсалютны чэмпіён свету па спартыўнай гімнастыцы Іван Іванкоў.

Дарэчы, праз два месяцы пасля сусветнага першынства ён жа перамог у многабор'і на чэмпіянаце Еўропы. Такога поспеху не ведаў ні адзін беларускі гімнаст, нават славуты Віталь Шчэрба, які на гэты раз аказаўся шостым сярод дзесяці мацнейшых спартсменаў года.

Другім лаўрэатам названы чэмпіён свету па цяжкай атлетыцы Аляксандр Курловіч, на рахунку якога шэсць сусветных рэкордаў: два — у рыўку, два — у штуршку і два — у суме двяабор'я (457,5 кг). Трэцяе месца заняла сярэбраны прызёр Лілехамера, пераможца Кубка свету біятланістка Святлана Парамыгіна.

У дзесятку мацнейшых увайшлі таксама канькабежац Ігар Жалязоўскі (4 месца), лёгкаатлет Уладзімір Дуброўшчык (5), тэнісістка Наталля Зверава (7), гімнастка Ларыса Лук'яненка(8), шахматыст Барыс Гельфанд (9) і лёгкаатлетка Наталля Духнова (10).

Такія вынікі традыцыйнага навагодняга конкурсу, які праводзіцца сярод спартыўных журналістаў рэспублікі газетай "Фізкультурнік Беларусі" і Нацыянальным алімпійскім камітэтам.

БЕЛІНФАРМ.

Святочная выстава

У святочныя калядныя дні ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь пачала працаваць выстава "Мастацтва Беларусі XVI–XIX стагоддзяў". Усе творы ўзяты з калекцыі рэстаўратара В.К.Цвірко.

Як вядома, за гады бальшавіцкага панавання ўлада зруйнавала шмат цэркваў і касцёлаў. Пад час гэтай віхуры загінулі каштоўнасці беларускага народа — уніяцкія, каталіцкія і праваслаўныя абразы, старажытныя кнігі. На выстаўцы прадстаўлена невялікая частка з уцалелага. Абразы, драўляныя скульптуры, узоры тканін XVIII—XIX стагоддзяў. На жаль, некаторыя творы мастацтва, асабліва абразы, знаходзяцца не ў лепшым стане.

Уладзімір СТАРАСЦЕНКА.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ – СЯМ'Я

У Японіі праведзена апытанне грамадскай думкі аб размеркаванні сямейных абавязкаў.

Як выявілася, большасць японак жадаюць прысвяціць сябе сям'і. Муж жа, на іх думку, павінен не толькі працаваць, але і дапамагаць па гаспадарцы. 89 працэнтаў японак наогул лічаць, што пасля нараджэння дзіцяці жанчына павінна забыць пра ўсё на свеце і думаць толькі пра яго выхаванне.

НАЎРАЦІЛАВА ЗОЙМЕЦЦА ТВОРЧАСЦЮ

Марціна Наўрацілава пакінула спорт.

Цудоўная тэнісістка, якая 22 гады выступала ў спаборніцтвах, закончыла сваю кар'еру ва ўзросце 38 гадоў. Яе найбліжэйшыя планы — добра адпачыць на лыжах у цяжкадаступных гарах у Канадзе, а потым выдаць два свае раманы. Першы з іх Марціна Наўрацілава збіраецца надрукаваць ужо ў 1995 годзе.

Д'ЯБАЛ СПАКУСІЎ

У Аўстраліі была прыцягнута да суда 48-гадовая манашка.

Яе злачынства зводзілася да таго, што сястра каталіцкага ордэна Святога Іосіфа выкрадала з крамы кніжкі пра каханне. Штомесяц яна папаўняла сваю бібліятэку дзесяццю-пятнаццаццю слёзнымі раманамі. Суд паблажліва аднёсся да грэшніцы і вызначыў ёй выплаціць штраф у 77 даляраў.

ПА ПАКУПКІ У ЗААПАРК

У Лондане налічваецца зараз прыклад..на 5 тысяч чалавек, якія сталі ўладальнікамі самых экзатычных жывёл сталічнага заапарка.

Англічане дораць сваім дзецям пінгвінаў, сланоў, рысяў. Вядома ж, "габарытныя" жывёлы застаюцца ў заапарку, але забяспечваюць сваіх гадаванцаў кормам самі гаспадары. Гэта дазволіла знізіць дзяржаўныя выдаткі на ўтрыманне жывёл на 150 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Дарэчы, пра цэны. Слон, напрыклад, каштуе 6 тысяч фунтаў. А такія жывёлы, як насарог, львы, тыгры абыходзяцца пакупнікам у два разы танней.

ТЫТУНЁВАЯ ВАЙНА

Улады Нью-Йорка прынялі пастанову, якая забараняе курыць у публічных месцах, у тым ліку і ў рэстаранах.

Ніякія пратэсты не дапамаглі ўладальнікам гэтых устаноў і тытунёвым дзялкам. Адна з самых буйных тытунёвых фірм "Філіп Морыс" назвала закон "драконаўскім" і паабяцала змагацца за яго адмену. Паводле падлікаў, з-за нововядзення колькасць наведвальнікаў, якія кураць, скароціцца на 10 працэнтаў, што, у сваю чаргу, выклікае звальненне каля 10 тысяч афіцыянтаў, а гарадскі бюджэт страціць 26 мільёнаў даляраў.

У ПЯЧОРЫ – НАВАСЕЛЛЕ

У Галандыі створаны запаведнік, насельнікамі якога стануць ... людзі.

Пячорнымі людзьмі, якія будуць жыць у сапраўднай пячоры, згадзіліся стаць на два месяцы 7 антраполагаў — 3 мужчыны і 4 жанчыны. У запаведніку створаны тыя ж умовы, у якіх нашы продкі жылі ў пачатку і тысячагоддзя да нашай эры.

АДАМ І ЕВА

Зімовы раман

Я заўсёды лічыла сябе не такой, як іншыя (ну што б я была за жанчына, калі б думала інакш? І хто з нас у тыя ці іншыя моманты не адчуваў сваёй перавагі над астатнімі прадстаўніцамі прыгожай палавіны?).

Але хоць слых мой і ўспрымаў даволі трывіяльныя кампліменты аднакурснікаў, а зрок улоўліваў зачараваныя позіркі больш старэйшых мужчын, сэрца заставалася раўнадушным як да першых, так і да другіх. У іх не было загадкі. Іх думкі і жаданні чыталіся па тварах з той самай дакладнасцю, з якой па прыкметах і з'явах у прыродзе можна беспамылкова вызначыць пару года. Хаця на першы погляд яўнага падабенства не назіралася. Знешне яны здаваліся зусім рознымі, мае патэнцыяльныя "хлопчыкі". Высокія і ніжэй сярэдняга, мускулістыя і не вельмі, хударлявыя і "з жывоцікамі", начытаныя разумнікі (ах, Мандэльштам!) і адпетыя шалапуты. Але ўсіх іх аб'ядноўвала і выроўнівала неадольнае, усёпаглынальнае, нязгаснае жаданне — зацягнуць мяне ў ложак. З першага спаткання, трэцяга, дзесятага — якая розніца?— іх вочы пачыналі гаварыць лепш за раскрытую кнігу. Шляхі, якія павінны былі ў рэшце рэшт прывесці да запаветнай мары, таксама не адрозніваліся арыгінальнасцю. Адзін—два паходы ў кіно на фільм "да васемнаццаці" (апошні сеанс плюс апошні рад), адно—два наведванні кафэ (нешта накшталт мадэрнізаванай студэнцкай сталоўкі), тры "дохлыя" гваздзікі на восьмае сакавіка (за маміны грошы) і шмат кактэйляў "Крывавая Мэры" (гарэлка з таматным сокам), прыгатаваных ва ўмовах інтэрнатаўскай кухні. На наступны дзень ад кактэйля страшна балела галава, на якую, акрамя фізіялагічных фактараў, давіла адчуванне спустошанасці і незваротнасці немаведама на што патрачанага часу.

Праз год я ўжо не магла спакойна глядзець на моцную палову, якая, як ні ў чым не бывала, працягвала змагацца паміж сабой за права прапаноўваць мне сваю тактыку захопу запаветнай "тэрыторыі". На трэцяй старонцы кожнага новага рамана ўжо хацелася пазяхаць... Адчуваючы гэта, мужчыны пачыналі нервавацца, прыспешвалі ход падзей, у некаторых выпадках нават спрабавалі замяніць традыцыйную "Мэры" на менш традыцыйны лікёр, а "неданошаныя" гваздзікі — на цнатлівыя бутоны ружаў... Аднак прапановы, якія ішлі ўслед за гэтым, не адрозніваліся навізной. "Уступная частка" аказвалася толькі шырмай, што прыкрывала сапраўдныя намеры..

Я не была пурытанкай, але цярпець не магла "кахання" ў пад'ездах. Мне, падабаецца, калі людзі пры ўсіх цалуюцца на вуліцы. А вось у прыцемках ці пры святле напаўразбітай лямпы, намагаючыся хутчэй расшпіліць тое, што чамусьці не расшпільваецца, зняць тое, што не здымаецца — такога задавальнення пазбаўце. Да таго ж, у пад'ездах вельмі халодныя сцены — яны здольныя астудзіць нават самыя гарачыя пачуцці і надаць ім зусім супрацьлеглы тэмпературны знак...

Словам, да таго часу, калі ў аўдыторыі аднойчы з'явіўся Ён, я ўжо высвабадзілася ад даволі небяспечнага жаночага правіла № 1: кожная студэнтка за тэрмін навучання ў ВНУ павінна выйсці замуж ці хаця б забяспечыць сябе патэнцыяльным прэтэндэнтам на азначаную ролю. І калі прыйшоў "бум" кароткіх спадніц, я з прынцыпу насіла доўгія, дэманструючы такім чынам свае "дафенісцкія" адносіны да патрэб мужчын (а яны аж пішчэлі — так хацелі бачыць мае прыгожыя ножкі). І вось у той самы момант, калі я ўжо зусім страціла надзею сустрэць чалавека, які перш, чым цікавіцца маёй анатоміяй, паспрабаваў бы спачатку ацаніць вартасці душы, прыйшло выратаванне.

У раскладзе першай "парай" значылася замежная літаратура нейкага там перыяду, чытаць якую павінна была зусім іншая — непрыемная, ганарыстая, з вельмі пышнымі формамі і занудным голасам — выкладчыца. Седзячы за апошнім сталом, мы з сяброўкай збіраліся прысвяціць дзве гадзіны абмеркаванню ўласных праблем. Але адчыніліся дзверы і...

Ты не быў падобны ні да аднаго з тых вытанчаных спакуснікаў-сэрцаедаў, якіх яшчэ нядаўна гэтак шчодра дарыў мне лёс. Высокі, падцягнуты, сур'ёзны, нават занадта.

У строгім касцюме і пры гальштуку. Перад тым, як пачаць знаёмства з групай, дастаў з дыпламата і надзеў акуляры... На маім не зусім звычайным прозвішчы ты, як і большасць "новенькіх" выкладчыкаў, крыху спатыкнуўся і назваў яго няправільна, выклікаўшы традыцыйнае хіхіканне. Я спакойна і стрымана выправіла памылку. Ты папрасіў прабачэння і, як мне здалося, пачырванеў. Гэта было наша першае і апошняе касмічнае збліжэнне перад доўгімі-доўгімі месяцамі барацьбы... Твой заручальны пярсцёнак — яскравае сведчанне сямейнага становішча — мяне не палохаў. (Большасць "акальцаваных" мужчын да разраду шчасліўчыкаў не аднясеш: знаходзячыся ў шлюбе, яны адчуваюць сябе адзінокімі). Я хацела толькі аднаго: каб калі-небудзь ты ўзяў маю руку ў сваю і прапанаваў ісці далей разам. Куды і як доўга — значэння не мела. Проста ісці — пад тваёй аховай, з тваімі падтрымкай і ўвагай, клопатам і пяшчотай.

Я не ведала, як і з якога боку падступіцца да цябе — настолькі далёкім і недасягальным здаваўся ты напачатку, і такою непераадольнай уяўлялася адлегласць паміж мной і табой. Пятнаццаць дзяўчат-аднакурсніц глядзелі на цябе калі не закаханымі, дык ва ўсякім разе зацікаўленымі вачыма — яны таксама не былі дурніцамі і без асаблівых складанасцей здолелі адрозніць сапраўдную каштоўнасць ад падробкі... Пацягнуліся дні і месяцы маіх пакут. Былі моманты, калі я амаль канчаткова страчвала надзею і спрабавала пераключыць свой мозг, зацыклены на табе, на больш лёгкую "здабычу". Нічога не атрымлівалася — душа мая прагла напружанай і цяжкай працы над сабой і імкнулася толькі да цябе. Твайго любімага Драйзера я прачытала ад коркі да коркі і на экзамене (ёсць Бог на свеце!) выцягнула шчаслівы білет. Ты апладзіраваў мне пасля адказу на першае пытанне, але паставіў не "выдатна", а "добра" з-за няведання нейкай французскай літаратурнай плыні.

Потым былі летнія канікулы, на якіх я рабіла ўсё магчымае, каб выкінуць цябе з галавы: купалася ў моры да адурэння, загарала і заводзіла адзін за адным нічога не вартыя паўднёвыя раманы. Першай навіной, аб якой я даведалася, вярнуўшыся да родных пенатаў, было тое, што цябе прызначылі нашым куратарам замест звольненага "мовавед а". Лёс не збіраўся разводзіць нас у розныя бакі, і я ўбачыла ў гэтым добры знак. Але ты па-ранейшаму заставаўся недасягальным. Лекцыі па тваёй спецыялізацыі скончыліся яшчэ ў мінулым семестры, і ўжо нельга было запраста падысці да цябе і задаць пытанне, якое першым прыйшло ў галаву, а потым цэлых пяць хвілін слухаць твой голас, глядзець табе ў вочы і рабіць выгляд, што мяне вельмі-вельмі хвалюе лёс нейкага Клайда Грыфітса... Сяброўкі-аднагрупніцы і тут знайшлі выйсце — па чарзе бегалі на кафедру літаратуры з быццам бы геніяльнымі прапановамі па падрыхтоўцы да навагодняга свята. Я, відаць, адзіная не насілася да цябе ў кабінет за каментарыямі да вершаў уласнага сачынення ці з прапановай выбраць музыку для вечара з процьмы аўдыякасет... Хоць часам моцнае жаданне бачыць цябе гатова было і мой розум падштурхнуць да пошуку якой-небудзь "важкай" нагоды. Але нешта стрымлівала і падказвала не скарацца, не слухацца звычайных жаночых слабасцей. Часам на перапынках ты заходзіў да нас сам — як заўсёды, строгі, сур'ёзны, стрыманы. У знешнім выглядзе — нічога лішняга, непатрэбнага. Адсутнасць лекцый у нашай групе дазваляла табе крыху расслабляцца — дасціпна жартаваць, прыемна ўсміхацца, тактоўна абыходзіць правакацыйныя пытанні, якімі ўвесь час імкнуліся засыпаць цябе нашы прыгажуні. У такія моманты я рабіла выгляд, што чытала канспект, але ні на імгненне не выпускала цябе з поля зроку. Гэта былі лепшыя хвіліны за тыя некалькі месяцаў — мы размаўлялі толькі поглядамі. Так-так, набраўшыся аднойчы смеласці і падняўшы вочы, я сустрэла твой добры, сумны і, як мне здалося, крыху разгублены позірк. Позірк мужчыны, які не ведаў, што рабіць далей. Некалькі імгненняў мы чапляліся адзін за аднаго вачыма, не ў стане перарваць нечаканую зрокавую сувязь. Ты перапыніў гаворку, занерваваўся, як хлопчык, рэзка кануўся з месца і амаль выбег з аўдыторыі... Я магла святкаваць перамогу. Але яна здавалася такой крохкай, як тыя самыя пачуцці, якія я выклікала ў цябе. І ўсё ж, гэта быў не сон, і з месяц пасля таго доўгімі асеннімі начамі я не магла заснуць, пакутуючы ў халодным інтэрнацкім пакоі ад прыліваў гарачых хваляў пры адным толькі ўспаміне пра твае вочы. Я баялася згубіць ці забыць твой погляд, у соты, тысячны раз узнаўляючы яго ў сваёй памяці. Такога са мной ніколі раней не здаралася: вылепіць у думках вобраз і амаль год (!) заганяць у абалонку ўласныя пачуцці... Іх стала немагчыма стрымліваць, яны маглі або спаліць усё ўнутры, спустошыўшы душу, або вырвацца вонкі, змятаючы на сваім шляху апошнія перашкоды. Я не была пурытанкай, і таму больш схілялася да апошняга варыянту, тым больш, што аб'ект, на які я збіралася нацэліць усю нерастрачаную за год пяшчоту, здаваўся вартым яе, як ніхто іншы.

Надышло навагодняе свята, а з ім — факультэцкі вечар, за падрыхтоўку да якога адказваў наш курс. Я напісала пародыі (ці сяброўскія шаржы) на аднакурснікаў, шмат смешных дасціпных вершыкаў. Усе рагаталі, як ашалелыя, ты — таксама. І ўжо, не саромячыся, падагрэты ці то поспехам мерапрыемства, ці то віном, глядзеў на мяне. Раптам я адчула, што мне не хапае паветра. Папрасіўшы прабачэння ў суседзяў, выйшла за дзверы залы, у калідор, адтуль — на лесвічную пляцоўку. Пастаяўшы некалькі хвілін, павярнулася, каб ісці назад... Але чыесьці рукі — такія гарачыя, што апякалі праз тканіну, моцна абхапілі мяне... Нічога не разумеючы, я паспрабавала ўхіліцца ад частых вільготна-гарачых пацалункаў. "Не-не, нікуды не адпушчу..." — перарывіста шаптаў ён. А гэта быў менавіта Ён. Той самы, пра каго я цэлы год — доўгі-доўгі год — баялася нават марыць. Непрыступны... Высакародны... Далёкі... Блізкі... Чужы.

Я адразу абмякла і перастала супраціўляцца. І пакуль ён ліхаманкава расшпільваў гузікі (якія, як заўсёды, не хацелі расшпільвацца), з пад маёй белай празрыстай блузкі, аднекуль з глыбіні, выпырхнула гэткае ж празрыстае, чыстае, падобнае да птушкі, амаль нябачнае воблачка. Гэта адлятала каханне.... Магчыма, першае. Магчыма, апошняе.

* * *

Няважна, калі і дзе я падслухала гэтую гісторыю. Дастаткова таго, што яна магла адбыцца з кожным...

Наталля СТРАЛКОВА.

У 1995 ГОДА – РЫЦАРСКІ ХАРАКТАР

Па ўсходняму японскаму гараскопу людзі, якія нарадзіліся ў год Дзіка, вызначаюцца храбрасцю і здольнасцю да самаахвяравання. Прызнаюць толькі прамы шлях, не ведаюць адхіленняў. Вельмі сумленныя і мужныя людзі. З іншымі людзьмі сыходзяцца з цяжкасцю, але сваім нешматлікім сябрам застаюцца вернымі да канца жыцця. Немагаслоўныя, але вельмі цікаўныя, шмат чытаюць, добра інфармаваныя. Бываюць запальчывымі, але не любяць сварак і спрэчак. Добрыя і ўважлівыя да каханага(ай) і знаёмых, хоць іх сямейныя справы і не заўсёды ідуць гладка. Імкнуцца ліквідаваць усе канфлікты. Якія б складаныя праблемы перад імі ні ўзнікалі — яны ніколі не апускаюць рук.

Народжаным у год Дзіка ідэальна падыходзяць як сябры або спадарожнікі жыцця Трус, Авечка; падыходзяць больш ці менш Пацук, Тыгр, Вол, Певень, Сабака, Дзік; рашуча не падыходзіць Змяя.

Па ўсходняму кітайскаму гараскопу ў Свінні рыцарскі характар. Далікатная, паслужлівая, вельмі патрабавальная. Вы можаце давяраць ёй, яна ніколі не будзе старацца падмануць каго-небудзь. Наіўная, даверлівая, безабаронная. Але не верце яе знешняй слабасці, яна толькі міралюбіва.

Жанчына гэтага знака любіць рабіць падарункі. Гэта добрая гаспадыня. У яе бойкі характар. Яна можа прысвяціць сябе ўсякай прафесіі і будзе заўсёды добрасумленнай і працавітай. Дзякуючы сваёй адчувальнасці, можа дамагчыся поспеху ў некаторых відах мастацтва, такіх, як паэзія і літаратура. Але адна з самых непрыемных рыс — прыхільнасць да "бруду", таму што яна ўсё ж свіння...

З матэрыяльнага пункту гледжання, яна заўсёды знойдзе тое, што неабходна для пражытачнага мінімуму. На працягу ўсяго жыцця нехта будзе аказваць ёй падтрымку, якая дапаможа ёй дасягнуць вышэйшых фінансавых сфер. У народнай мудрасці гаворыцца, што "ёй заўсёды даставяць харчаванне з задняй думкай, каб яна стала сытай і яе можна было б з'есці ў навагодняе свята". Таму ёй неабходна быць асцярожнай і не давяраць нікому.

Яна часта закаханая, але і не менш таго расчараваная. Жанчына-Свіння будзе добрай маці. Ёй трэба звязваць сваё жыццё з Катом. Неабходна пазбягаць Змяю.

Будучы добрым Іграком, ніколі не выказвае дух спаборніцтва. Незвычайна шчырая. Вясёлы сябар у кампаніі.

Як і Малпа, Свіння — інтэлектуал. Шмат чытае, але без разбору.

Пад лагодным выглядам Свіння хавае волю і ўладарнасць. Калі яна прыняла якое-небудзь рашэнне, ніхто ёй не перашкодзіць. Але перш за ўсё яна будзе ўзважваць усё "за" і "супраць".

Першая палова жыцця Свінні будзе адносна спакойнай. На працягу другой могуць узнікнуць усялякія праблемы ў сямейным жыцці. Але яна сама будзе шукаць выйсця.

Калі яна нарадзілася задоўга да свята, то пазбегне непрыемнасцей, але чым бліжэй дата яе нараджэння да свята, тым больш у яе шанцаў быць "з'едзенай".

Год, спрыяльны як для фінансістаў, так і для інтэлігенцыі. Усё ідзе цудоўна. Добрыя справы. Грошы вяртаюцца. Можна смакаваць радасць жыцця. Але магчымы некаторыя непрыемнасці адміністрацыйнага парадку.

ПАЦУК — Усё Ідзе добра. Ён шчасліва жыве, састаўляе планы на будучыню.

БЫК — Год мог быць лепшым. Вельмі многа работы. Ён з цяжкасцю зможа завяршыць яе.

ТЫГР — У яго добрыя справы, рызыкуючы ўсім, ён атрымлівае дывідэнды. Няхай працягвае.

КОТ — Супакоены. Мурлыча і асуджае сваіх сяброў. Адчувае сябе ў небяспецы.

ДРАКОН — Ён зіхаціць! Канешне, у яго ніколі не было цяжкасцей з грашыма, але ў гэтым годзе дзякуючы яго спрытнасці добра будуць ісці справы.

ЗМЯЯ — Нічога прыемнага, але яна мірыцца з гэтым і разважліва чакае лепшага часу.

КОНЬ — У яго будуць грошы, і ён зможа аплаціць тое, пра што даўно марыць: машыну, кватэру...

КАЗА — Поспех іншых прынясе ёй шчасце, таму што яна сумее гэта выкарыстаць. Ёй неабходна быць больш асцярожнай. Але яна ігнаруе сэнс гэтага слова.

МАЛПА — Скончыўся адваротны бок фартуны папярэдняга года. Зноў справы. Яна неўтаймаваная.

ПЕВЕНЬ — Шмат працы! Ён з цяжкасцю ўзбіраецца па фінансаваму адхону. Застанецца кансерватарам насуперак сваёй цікавасці.

САБАКА — Яму прыйдзецца паклапаціцца аб сваім дабрабыце ў гэты год, аб сваёй сям'і таксама. Гэта карысна час ад часу.

СВІННЯ — Год задавальняе яе. Яна будзе шчасліва ў каханні і ў справах. Можа атрымаць спадчыну або вялікую суму.

Як добра, што на свеце засталіся яшчэ вечныя святы — Каляды (Нараджэнне Хрыстова) і сустрэча Новага года. Напярэдадні іх асабліва прыемныя перадсвяточныя клопаты. І якім бы цяжкім ні было зараз наша жыццё, у кожнай сям'і рыхтуюцца да сустрэчы Новага года, не забываюць і пра падарункі адзін аднаму.

Дапамагчы ў гэтым мінчанам і гасцям сталіцы ўзялася кампанія "Экспасервіс", арганізаваўшы шоу-выставу "Навагодні мінскі кірмаш". Яна працягнецца ўвесь тыдзень.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ.

9x12

Спявае Іна Афанасьева

Пасля яе песень не замаўкаюць доўга апладысменты, яе часта выклікаюць на "біс", яна, Іна Афанасьева, — салістка Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга — адна з самых папулярных артыстаў эстрады пакарыла сэрцы і душы многіх сваіх прыхільнікаў. І таму не дзіўна, калі яна завітала ў Асіповічы і мне прадставілася магчымасць пагутарыць з гэтай папулярнай спявачкай.

— Іна, чаму Вас так любяць гледачы?

— Скажу па шчырасці: не ведаю. Магчыма таму, што я стараюся данесці да сваіх слухачоў і гледачоў прыгажосць, я ведаю, што сказаць ім. А калі зноў жа па шчырасці, то я поўнасцю выкладваюся...

— І адкуль у Вас усё гэта? Крыху пра сябе.

— Адкуль? Мае карані ў Магілёве. Бацькі — Уладзімір Міхайлавіч і Ніна Пятроўна нядрэнна спявалі і я рана дакранулася да песеннага мастацтва. І ўжо ў дзяцінстве закралася мара, якая ажыццявілася.

— А дзе адбыўся Ваш дэбют?

— Першы раз я выступала на конкурсе польскай песні ў Віцебску. Стала лаўрэатам і мяне запрасілі ў Дзяржаўны аркестр Беларусі , якім кіруе Міхаіл Фінберг. І вось ужо 7 гадоў, як я на сцэне...

— Ну, якая Ваша тэма, так сказаць, галоўная?

— Відаць песні на тэмы кахання...

— А над чым працуеце зараз?

— Работы хапае. Ну, перш за ўсё запісваю аўдыёкасеты са сваімі песнямі, якія выконвала раней і цяперашнімі. Думаю, што ў хуткім часе, а калі дакладней, то, магчыма, і ў канцы гэтага года, яна выйдзе і яе ацэніць слухач. Здаецца добрай будзе і новая песня "Палюбоўніца", словы вядомага паэта Леаніда Пранчака, музыка Алега Казловіча. Ёсць і іншыя задумкі. Мару стварыць сваю асабістую праграму, якая не толькі зацікавіла б, але і спадабалася маім прыхільнікам.

— А хто падтрымлівае, дапамагае Вам? Усё-такі хлеб спявачкі і тым больш такой папулярнай, як Вы, нялёгкі?

— З Вамі цяжка не пагадзіцца. Частыя раз'езды, выступленні накладваюць свой адбітак. І дапамагае мне мой муж. Ён разумее мяне ва ўсім, як кажуць, мая правая рука. У нас расце сын, яму чатыры гады, многае звязваю з ім, вельмі сумую калі разлучаюся.

— І кім бы Вы хацелі бачыць свайго сыночка?

— Гэта пытанне традыцыйнае і яго мне задаюць вельмі часта. Кім сам захоча, тым хай і будзе. Застаўляць яго ні я ні муж не будзем. Галоўнае, каб ён стаў добрым чалавекам, быў патрэбны людзям і рабіў дабро.

— А Ваша галоўная мара?

— Дарыць людзям добрыя песні, спяваць, каб стварыць ім добры настрой, радаваць іх у такі нялёгкі час. І мне прыемна, калі чую добрыя словы ў свой адрас, калі пазнаюць на вуліцы. Хачу і мару, каб людзям жылося лепш...

— Іна, ні для каго не сакрэт, што Ваш дуэт з Валерыем Дайнекам — удалы поспех. Так многія лічаць, ці гэта проста выпадковасць?

— Тут пытанне трэба было паставіць інакш...

Але я адкажу. Усё адбылося сапраўды нечакана і, відаць, выпадкова. Валерыя Дайнеку слухачы і гледачы ведаюць добра, бо на сцэне ён ужо выступае 20 гадоў. І калі мне прадаставілася магчымасць паспяваць разам, то грэх было адказвацца, і мы праспявалі разам некалькі песень. Атрымалася нядрэнна. У бліжэйшы час, думаю, наш дуэт парадуе гледача новай песняй.

— Ваша хоббі?

— Люблю прыроду, лес, чытаць. Падабаюцца Тургенеў, Дастаеўскі... Але добрых кніг рускіх класікаў зараз знайсці цяжка. Ёсць і іншыя захапленні і, зразумела, добрыя песні, бо без іх цяжка сёння пражыць?

— Вашы планы на будучае?

— Вельмі хачу спяваць новыя песні, хачу каб было больш гледачоў на маіх канцэртах. Каб больш было добрых спевакоў.

— Дзякуй. І поспехаў Вам.

Гутарыў Іван СЦЯПУРА.

На здымку: Іна АФАНАСЬЕВА з сябрамі пад час запісу навагодняга тэлешоу.

31, субота

Беларускае тэлебачанне

8.00. Навіны.
* 8.10. Мультфільмы.
8.30. Кінаканцэрт.
9.20. Здароўе.
9.50. "Казкі навагоднiй ёлкі". Спектакль для дзяцей.
10.25. Фестываль "Тэлебом" у Магілёве.
* 11.25. "Лулу – анёл кветак".
◆12.00. "Казка пра зорнага хлопчыка", 1–я і 2–я серыі.
14.10. "Дзівакі з Баркаўцоў". Спектакль.
14.45. Тэлекрама.
14.55. "Усё нармальна, мама". Забаўляльная праграма.
15.25. Міжнародныя спартыўныя навіны.
◆15.55. "Эскадрон гусар лятучых". 1-я і 2-я серыі.
18.45. Банка коміксаў.
* 19.15. "Пустамеля"і інш.
19.40. Шоу "Палігон".
20.20. Прэм'ера цыкла. Дзень стагоддзя.
20.30. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. Пад купалам Сусвету.
21.50. Прэм'ера цыкла."Вясёлы уік-энд".
22.00. Прэм'ера цыкла. "Шоу-прагноз".
22.10. Прэм'ера цыкла. "Класклуб".
◆22.40. "Кахаю..."
23.30. "Беларусь сустракае Новы год".
23.45. Навагодняе віншаванне А.Лукашэнкі.
24.00. Фаварыты года. Тэлевізійны фестываль песні.
◆1.50. "Гусарская балада".
◆3.25. "Міс Катастрофа".
5.00. Кінаканцэрт.

Канал "Астанкіна"

7.15, 12.05, 14.00, 15.10, 16.50, 22.10. Ідзе Новы год.
* 7.20. Мультфільм.
7.30. Слова пастыра.
7.45. Покліч джунгляў.
8.15. Авіякасмічны салон.
8.30. Тэлерадыёкампанія "Мір".
10.00. Раніцняя пошта.
10.30. Без паўзы.
10.40. Смак.
10.55. Балет П.І.Чайкоўскага "Шчаўкунчык".
◆12.10. "Зігзаг удачы".
13.50. Навіны.
14.10. "Тэлескоп".
15.15. У свеце жывёл.
15.55, 20.35. Надвор'е.
16.00. Шчасліва выпадак.
17.00. Ралі "Парыж–Гранада–Дакар".
◆17.05. "Казіно "Рояль" (ЗША).
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны плюс.
20.45. Што? Дзе? Калі?
22.15. Навагодняя сустрэча ў Маскве.
22.50. З Новым годам!
23.05. Працяг навагодняй сустрэчы.
3.00. "Лідо дэ Пары". "Бравісіма".

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
◆7.25. "Сабачае шчасце".
8.35. Тэлеэрудыт.
8.40. Парламенцкі тыдзень.
◆9.25. "Пячора "Залатой Ружы". 4-я серыя.
10.20. "Як жыць будзем?"
11.00, 11.45, 16.30, 17.05, 18.50, 19.25, 21.40, 21.50, 0.55, 1.55. Шчасця, удачы, надзей жадаюць вам А.Пахмутава, М.Дабранравай, Б.Ахмадуліна, Э.П'еха, А.Табакоў, Л.Зыкіна, А.Вазнясенскі, І.Кабзон, А.Баталаў, М.Озераў, Г.Жжонаў.
11.05. Футбол без граніц.
◆11.50. "Эдэра".
12.45. Дэ факта.
◆13.20. "Стары Новы год".
* 15.40. "Дванаццаць месяцаў".
16.35. Там-там навіны.
16.50. Свята кожны дзень.
17.00. Тэлеэрудыт.
◆17.10. "Вустрыцы з Лазаны".
18.30. Каробка перадач.
19.30. У гасцях у Ралана Быкава.
22.25. "Вавілонскія гульні": міжнародныя гладыятары.
22.30. Рэпарцёр.
22.50. Віншаванне з Новым годам.
23.05. Навагодняя ноч № 1995.
0.50. Зоркі гавораць.
1.00. Дэвід Коперфільд.
2.00. "Ціхі дом". Праграма С.Шолахава.
3.00. Танцавальны марафон.

Санкт-Пецярбург

* 8.55. "Украдзены твар".
9.30. Чароўная лінія.
9.45. Развітанне з Годам Сабакі.
10.40. "Адэскія песні" Аляксандра Разенбаўма.
* 11.20. "Чахарда".
11.25. "Апошняе снеданне адыходзячага года". Музычная праграма.
11.55. Паверце, Дзед Мароз сапраўдны.
* 12.35. "Мыльныя бурбалкі ката цётачкі Фло".
◆12.40. "Вясёлае снабачанне, ці Смех і слёзы". 1-я серыя.
13.45. Антрэ. Цырк навагодні.
14.05. "Вясёлае снабачанне, ці Смех і слёзы". 2-я серыя.
* 15.10. "Леата і Феафан".
15.35. Новыя песні А.Квашы.
* 16.05. "Іван і Мітрафан у засадзе".
◆16.15. "Італьянскі кантракт".
17.40. Экспрэс-кіно-95.
17.55. Аперацыя "Дзед Мароз". Уік-энд з дэтэктывам.
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Навагоднія віншаванні рэлігіёзных канфесій.
19.10. Вялікі фестываль.
19.30. Шоу за тры гадзіны да...
20.30. Аперацыя "Дзед Мароз". (Працяг).
20.40. "Не хочаш – не сустракай".
21.50. Ваш стыль.
* 21.55. Мультпанарама.
22.00. Тэлемост "Санкт-Пецярбург–Масква".
22.45. З Новым годам!
23.05. Тэлемост "Санкт-Пецярбург–Масква". (Працяг).

8-ы канал

15.00. Чатырохногія артысты Наталлі Дуравай.
◆15.45. "Марэна Клара".
* 17.15. Мультфільм.
17.40. СОЛТЭК. Спартыўная мазаіка.
18.10. Музычная праграма з удзелам "Брус Спрынгсін".
* 19.10. Мультфільм.
20.00. Комікс-відэа.
20.20. Абаяніе фантастычнай сілы. А.Шварцэнегер.
21.05. Студыя "БМ".
21.20. Сем хвілін з "Хрыстафорам".
◆21.35. "Вяртанне памяці".

НТБ

* 17.05, 17.45. Мультфільмы.
17.35, 18.35, 20.50. З Новым годам! 18.00. Сёння.
◆18.45. "У джазе толькі дзяўчаты".
◆21.00. "На Дзерыбасаўскай цудоўнае надвор'е, або На Брайтан-біч зноў ідуць дажджы".
22.40. НТБ сустракае гасцей.
22.55. Навагодняе віншаванне А.Пугачовай.
22.59. Масква. Чырвоная плошча.
23.02. Святочная праграма.
1.00, 3.25. Лепшыя шоу Бэна Хіла.
1.25. Зоркі сусветнага кіно ў негліжэ.
* 2.30. Мультфільм.

1, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

З Новым 1995 годам!
9.00. "Навагоднія сюрпрызы" для дзяцей і дарослых.
9.40. "Уся справа ў капелюшы". Забаўляльная праграма.
10.10. Навагодняя сюрпрызы.
◆10.15. "Пепялушка".
11.35. Дабрачынная навагодняя ёлка для дзяцей Беларусі.
12.35. Паміж намі,жанчынамі.
13.15. Прэм'ера цыкла "Размінка".
13.20. Сустрэча з удзельнікамі конкурсу прыпеўкі газеты "Звязда".
* 14.20. Мультканцэрт.
15.00. Тэлевізійны Дом кіно.
16.20. Тэлекрама.
◆16.30. "31 чэрвеня".
18.40. "Запрашаем на вячоркі".
19.20. Праспект.
* 19.50. "32 снежня".
20.05. Музычна-забаўляльная праграма.
20.30. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.50. Прэм'ера цыкла. "Бон-тон".
◆22.10. "Тунісовая жанчына" (Францыя–Італія).
23.50. Відзьма-нявідзьма.

Канал "Астанкіна"

7.15. Спортлато.
7.30. На балі ў Папялушкі.
8.30. Раным-рана.
9.00. Брэйн-рынг.
9.35. Пакуль усе дома.
10.05. Раніцняя зорка.
10.55. Навагодняя сустрэчы ў доме Растовых.
11.45. "Маё апошняе танга". Пётр Лешчанка.
12.35. "Шпаргалка" з падарункам.
12.50. Нацыянальнае геаграфічнае таварыства ЗША прадстаўляе: "Вечныя працаўнікі: львы і гіены".
13.50, 16.30, 22.50, 23.50. Навіны.
◆14.00. "Маё імя клоун" (Індыя). 1-я серыя.
15.10. Эх, шлях-дарожка франтавая...
15.20. Клуб падарожнікаў.
16.10. Тэлелоцыя.
16.40. Тэлефестываль "Песня-94". Навагодні выпуск.
18.25. Надвор'е.
18.30. Г.Хазанаў і П.Ізмайлаў.
19.20. Тэлефестываль "Песня-94". (Працяг).
21.00. Нядзеля.
21.50. Ралі "Парыж–Гранада–Дакар".
22.10. Парад фестываляў. Кіномода на заўтра.
◆23.00. "Сапраўдная гісторыя "Дамы з камеліямі" (Італія).

Канал "Расія"

7.00., 13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
* 7.25. Мульці-пульці.
8.50. "Рэт"-95.
◆9.20. "Пячора "Залатой ружы". 5-я серыя.
10.15. Добрай раніцы.
10.45. Рускае лато.
* 11.30. Мульці-пульці.
◆11.45. "Курыца".
◆13.20. "Эдэра".
14.15. Фільм-балет.
15.40."Львы Этэшы". Д/ф.
* 16.45. Чароўны свет Дыснея.
17.40. "Дон Кіхот і Дон Жуан". Спектакль.
19.25. Свята кожны дзень.
◆19.35. "Агенты КДБ таксама ўлюбляюцца".
21.15. "Маскі" ў гасцях у "Джэнтльменаў". Забаўляльная праграма.
22.30. Рака часу.
22.40. Аўтаімгненне.
◆22.45. "Рускі транзіт".
23.45. "Залатыя старонкі "Грэмі".
1.15. Зоркі гавораць.
◆1.20. "Дафніс і Хлоя".

Санкт-Пецярбург

* 8.55. Мультфільмы.
9.15. Студыя "Уяві".
9.30. Чароўная лінія.
9.45. Анонс мэлепраграм.
10.00. Рандэву. Э.П'еха.
10.35. "Дарагая Памела". Фільм-спектакль.
13.05. З Новым годам! Цыркавое прадстаўленне.
13.50. У гасцях у Ірыны Алегравай.
◆14.35. "Карнавальная ноч".
◆15.45. "Навагодняя гісторыя".
16.00. Навагоддзе ў "Паласатай музыцы".
16.20. Зебра.
17.05. Арт-буфет.
18.25. "Кубак мэра". Футбол-шоу.
19.30. Інфарм-ТБ.
19.55. Парад у навагоднім эфіры.
20.30. "Мадо, да запатрабавання".
22.10. Ваш стыль.
22.15. Анонс мэлепраграм.
◆22.30. Навагоднае прадстаўленне.
1.30. "Адам і Ева +".

8-ы канал

◆15.00. "Марэна Клара".
17.30. СОЛТЭК: "ПІК".
18.00. БАНТ: "Рэпартаж".
* 18.10. Мультфільм.
19.50. Пісьменнікі-сатырыкі.
◆20.05. "Мацнеё за д'ябла" (Індыя). Частка 1-я.
21.10. "Дайджэст".
◆21.30."Мацнеё за д'ябла" (Індыя). Частка 2-я.
22.40. Foxy music.

НТБ

17.00. Лепшыя з лепшых.
◆18.00. "Шэрыя ваўкі".
20.00. Выжыкі.
20.45. Лялькі.
◆21.10. "Сківіцы" (ЗША).
23.20. Зоркі фігурнага катання-94.

2, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

8.00. "Я помню дзіўнае імгненне..." Фільм-канцэрт.
8.50. Эканамікст.
◆9.00. "Разумныя рэчы".
* 11.10. "Востраў капітана". 11.40. Тэл.дак.фільмы.
12.40. Планета людзей. Міжнародная праграма.
◆13.10. "Палёт птушкі". 1-я і 2-я серыі.
15.20. "Небыліца". Фільм-канцэрт.
16.05. Залаты фонд. "Лянівая прыгажуня". Тэл.спектакль.
16.35. "Поле памяці". Тэл.дак.фільм.
17.05. Уладзімір Алоўнікаў. Прэм'ера араторыі "Партызанскія песні".
18.00. Навіны (з сурдаперакладам).
18.10. На добры лад.
* 18.20. "Страчаная Галактыка".
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Праспект.
19.30. Урокі Наталлі Наважылавай.
20.00. Студыя "Край". Усевалад Ігнатоўскі – гісторык і грамадзянін.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. Вертыкаль. Пошта Прэзідэнта.
22.10. Спартыўны тэлекур'ер.
22.30. Прэм'ера дак.фільма Беларускага тэлебачання "Варыяцыі".
* 22.45. "Белы матылёк", "Ліса".
23.05. Навіны.
23.25. Пад купалам Сусвету.
◆23.35. "Паласа Сімарона"

Канал "Астанкіна"

8.45. Брэйн рынг. Юнацкі турнір.
9.25. З Новым годам, дзядзечкі і цётачкі!
10.05. Што азначаюць вашы імёны.
11.20. Акно ў Еўропу.
11.55. Рызыкнуць і перамагчы.
13.00. Сусветная геаграфія. "Зебры: сляды на траве".
13.50, 23.20, 24.00. Навіны.
◆14.00. "Маё імя клоўн". (Індыя). 2-я серыя.
15.40. Музычныя прэм'еры 94-га.
16.35. Да і пасля...
17.25, 20.30. Надвор'е.
17.35. КВЗ-94. Фінал.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Час.
20.40. Сустрэча з А.І.Салжаніцыным.
◆21.00. "Татулька і мэм".
22.20. Кабарэ "Усе зоркі".
23.00. Ралі Парыж–Гранада–Дакар.
23.30. Магік-шоу.
0.10. Фестываль біг-бэндаў памяці Глена Мілера.

Канал "Расія"

8.00. Пілігрым.
◆8.45. "Пячора "Залатой ружы". (Італія). 6-я серыя.
9.35. "Залаты ключык". Адкрыццё фестывалю дзіцячай песні.
10.05. "Шчукінцы, цудоўны ваш саюз!".
10.50. Музыка ўсіх пакаленняў.
11.20. "Канцэрт фронту". Дак.фільм.
* 12.25. "Міс Новы год".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20. "Не высечы...".
13.35. Лепшыя гульні НБА.
14.35. Белая варона.
* 15.20. "Сіняя птушка".
16.10. Шарман-шоу.
17.25. Вуснамі дзіцяці.
18.10. Сам сабе рэжысёр.
19.25. Навагодняя дыскатэка "У Ксюшы".
* 20.25. "Падаў леташні снег".
◆20.45. "Дурніца". 1-я серыя.
22.30. Рака часу.
22.40. Аўтаімгненне.
◆22.45. "Дурніца". 2-я серыя.
23.55. На канцэрце групы "Дып Пепл" (Англія).

Санкт-Пецярбург

* 10.05. "Трое з Прастаквашына", "Канікулы ў Прастаквашыне", "Зіма ў Прастаквашыне".
10.55. Чароўная лінія.
◆11.10. "Востраў скарбаў". 1-я і 2-я серыі.
13.25. "Я зноў перад табою стаю зачараваны". Фільм-канцэрт.
13.55. Балет П.І.Чайкоўскага "Шчаўкунчык" у пастаноўцы Вялікага тэатра.
15.40. "З музыкай разам".
16.05. "Маленькая Баба-Яга". Спектакль для дзяцей.
17.20. Танцуе ансамбль "Сувенір".
17.40. Крыжыкі-нулікі.
18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
18.50. "Песні намяці маёй". Фільм-канцэрт.
19.10. Вялікі фестываль.
◆19.25. "Пілін Траўм". 1-я і 2-я серыі.
22.10. Ваш стыль.
22.15. "Гэта было нядаўна, гэта было даўно". Эдуард Хіль.
23.00. "У летнім садзе". Спектакль Вялікага тэатра лялек Санкт-Пецярбурга.

3, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. "Настане свая чарга". Тэл.фільм.
9.00. Вертыкаль. Пошта Прэзідэнта.
◆9.30. "Паласа Сімарона".
* 10.45. "Прыгоды капітана Урунгеля". 1–3-я серыі.
◆11.15. "Пра Чырвоную шапачку". 1-я і 2-я серыі.
13.30. "Фантазія для джэнтльмена".
14.05. У нас дома. Праграма для сям'і.
14.45. "Не пакідай, замілаванне...".
* 16.15. "Пластылінавая варона". "Снегураты".
16.35. "Дзеда Мароза выклікалі?..". Тэл.спектакль.
17.15. "Вяртанне Міхася Забойды-Суміцкага". Дак.фільм.
18.00. Навіны (з сурдаперакладам).
18.10. "Расказ аб агатах". Кінанарыс.
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Бізнес-рынг.
19.30. "Метамарфозы Ундзіны". Музычны відэафільм.
◆19.55. "Маё каханне, мой смутак".
* 20.25. "Страшыдла".
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. Студыя "Палітыка". Форум.
◆21.55. "Пракажоная". (Францыя). 1-я серыя.
22.50. Эканамікст.
23.05. Навіны.
23.25. Пад купалам Сусвету.

Канал "Астанкіна"

* 8.05. "Падаў леташні снег".
8.25. Хрусталь чаравічак.
9.25. Брэйн рынг.
10.05. "Краса і гордасць Расіі". Фільм 1-ы.
10.40. Зорная гадзіна.
11.25. "Не вячэрняя". Сляваа В.Панамарова.
12.15. Сусветная геаграфія. "Краіна тыграў".
13.10, 22.55, 23.50. Навіны.
◆13.20. "Маё імя клоун". 3-я серыя.
* 14.40. "Ноч напярэдадні Каляд" (ЗША).
15.40. Шырэй кругі
17.10, 20.30. Надвор'е.
17.20. У гэтыя дні праз 50 гадоў.
◆17.45. "Цуд ваўкоў". (Францыя–Італія).
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Час.
20.40. Ралі Парыж–Гранада–Дакар.
◆21.05. "Страчаная душа".
(Італія).
23.10. Пад знакам Задыяка. Шалі.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
◆8.00. "Наезнік-прывід". 4-я серыя.
* 8.30. "Снежная каралева".
◆9.35. "Пячора "Залатой ружы". 7-я серыя.
10.30. Аты-баты...
11.00. "Літаратурная газета" і яе сябры-паэты.
12.30. Рэтра-шлягер.
◆13.20. "Эдэра".
14.10. Калядныя сустрэчы ў паўночнай Пальмірыі.
* 14.55. "У яранзе гарыць агонь". "Паўночная казка".
15.25. Даміно Міхаіла Баярскага.
15.55. Свята кожны дзень.
◆16.05. "Нявеста з Парыжа".
17.30. L-клуб.
18.15. "Залаты Асман-94". Міжнародны фестываль сатыры і гумару.
20.20. "Высокая мода" ў Маскве.
* 21.40. Мультфільмы для дарослых.
22.30. Рака часу.
22.40. Аўтаімгненне.
◆22.45. "Нумар "люкс" для генерала з дзяўчынкай".

Санкт-Пецярбург

10.05. "Вер не вер", "Віні-Пух і дзень клопатаў", "Віні-Пух ідзе ў госці".
10.55. Чароўная лінія.
◆11.10. "Востраў скарбаў". 3-я серыя.
12.15. "Даражэй за жэмчуг і золата". Спектакль.
14.05. "Вечная вясна". Фільм-балет.
15.00. "Дон Жуан". Фільм-спектакль Цэнтральнага тэатра лялек.
* 16.30. "Снежная каралева".
17.30. Паласатая музыка.
17.40. Там, дзе жывае Паўцюнч.
17.55. "На біс". Сяргей Захараў.
18.30. Інфарм ТБ.
18.50. "Каляровае апярэнне ўсяго толькі ўпрыгажэнне?". Тэлефільм.
19.10. Вялікі фестываль.
19.25. М.В.Гогаль. "Мёртвыя душы". Фільм-спектакль. 1-я серыя.
20.10. "Падарожжа ў Італію І.-В.Гётэ". Тэлефільм.
20.35. "Кансерватар". Навагодні выпуск.
21.10. Ваш стыль.
21.20. Экран "Кансерватара". "Прадаўжэнне роду".
22.55. "О, Мельпамена!". Спектакль.

4, серада

Беларускае тэлебачанне

◆8.00. "Маё каханне, мой смутак".
8.30. "Ранак туманны". Фільм-канцэрт.
9.15. Эканамікст.
◆9.25. "Пракажоная". (Францыя). 1-я серыя.
10.20. Урокі Наталлі Наважылавай.
* 10.50. "Прыгоды капітана Урунгеля". 4–7-я серыі.
11.30. "Прыгоды Бураціна". 1-я і 2-я серыі.
13.40. Свет і чалавек. Філасофскія дыялогі.
14.10. Відзьма-нявідзьма.
◆15.10. "Авадзень". 1-я серыя.
16.20. "Паэт, мара і натхненне". Фільм-канцэрт.
17.00. "Чыпаліна, Таніна, Джаніна і іншыя". Тэл.спектакль.
* 17.30. "Помста ката Леапольда".
17.40. "Дзядзька Уласаў". Дак.фільм.
18.00. Навіны (з сурдаперакладам).
18.10. Канцэрт.
18.25. Навіны (Бі-бі-сі).
19.00. "Мой лёс пралёг праз вашыя дарогі..." Творчы вечар паэтэсы Вольгі Іпатавай.
◆20.05. "Маё каханне, мой смутак".
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. "У стылі джаз-рэтра". Фільм-канцэрт.
◆22.00. "Пракажоная". (Францыя). 2-я серыя.
22.55. "Пудзіла".
23.05. Навіны.
23.25. Пад купалам Сусвету.

Канал "Астанкіна"

◆8.25. "Дзікая Роза".
8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50. Навіны.
9.00. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
14.00. Вытворчасць: буйны план.
14.10. Грошы і шчасце.
14.20. Хроніка дзелавога жыцця.
14.30. Агенцтва "Шанц".
14.40. Дазвольце прадставіцца.
15.00. Паглядзі, паслухай.
15.20. "Лятаючы дом".
16.00. Цін-монік.
◆16.20. "Элен і рабята".
16.50. Свет сёння.
17.00. Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір".
17.40, 20.30. Надвор'е.
17.45. "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Маці Тэрэза.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.30. "Дзікая Роза".
18.55. Кіназорка М.Баярскі.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Час.
20.40. Манадог.
20.50. Ралі Парыж–Гранада–Дакар.
◆21.10. "Раман імператара". 2-я серыя.
23.20. Танцы, танцы, танцы...
23.50. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.00. Сусветныя навіны Эйбі-сі.
8.25. Ключавы момант.
* 8.35. "Апошні падарунак". "Шчаня з Сузор'я Гончых сабак".
9.50. З гісторыі рускага раманса.
10.20. Гандлёвы дом.
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
11.05, 13.20. Дзелавая Расія.
13.45. "Усміхніся". Джаз-панарама.
15.05. Там-там навіны.
15.20. Свята кожны дзень.
15.30. Студыя "Рост". "Вясёлыя старты".
16.05. Далёкі Усход.
16.45. Бяскушмныя лідэры.
17.15. Ніхто не забыты.
17.20. Зімні карагод.
17.40. Кар'ера.
18.10. Ваша права.
18.25. Свая гульня.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Балада пра салдата".
21.15. Кліп-антракт. А.Вескі.
21.25. "Бэт Дэвіс. Актрыса і зорка". Праграма В.Вульфа.
22.30. Рака часу.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Экран крымінальных паведамленняў.
22.55. Тэатр песні Аляксандра Асокіна.

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30. Інфарм ТБ.
* 12.10. "Верашок".
12.30. "Нямецкая хваля".
12.50, 14.45, 17.50, 19.25. Музычны момант.
◆12.55. "Без сям'і". 1-я серыя.
14.15. Урок нямецкай мовы.
◆14.50. "Мадо, да запатрабавання".
16.25. Чароўная лінія.
* 16.40. "КААДП. Сімбіёз".
16.50. Казка за казкай.
17.55. Гістарычны альманах.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.10. Вялікі фестываль.
19.30. М.В.Гогаль. "Мёртвыя душы". Фільм-спектакль. 2-я серыя.
20.35. Блеф-клуб.
21.10. Тэлемагазін.
21.15. Тэлеслужба бяспекі.
21.45. Спартыўныя навіны.
22.00. Ваш стыль.
22.10. "Канцэрт Жульет Грэко ў зале "Алімпія". Тэлефільм (Францыя). Частка 2-я.
22.55. "З днём нараджэння, ці Інкогніта". Фільм-аперэта.

5, чацвер

Беларускае тэлебачанне

7.55. Праграма перадач.
◆8.00. "Маё каханне, мой смутак".
8.30. Фільм-канцэрт.
◆9.00. "Пракажоная". 2-я серыя.
* 9.55. "Прыгоды капітана Урунгеля".
◆10.25. "Рыжы, сумленны, улюбёны".
12.55. "Пап-Ці" –TV.
13.50. Сустрэча з А. Лебедзем і Г.Жжонавым.
14.25. Здароўе. Тэлечасопіс.
14.55. "Вось і мы..." Сляваа Ларыса Доліна.
◆15.25. "Авадзень". 2-я серыя.
16.30. Праграма перадач.
16.35. "Мудрасць дабрыні". Спектакль.
17.40. Вывучаем сваю гісторыю.
18.00. Навіны (з сурдаперакладам).
* 18.10. "Кошчын дом".
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Што ні край , то свой звычай".
19.40, 20.05. "Крок".
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. Студыя "Палітыка". Інтэр-інфа.
◆21.55. "Пракажоная". 3-я серыя.
* 22.50. "Ракавое каханне".
23.05. Навіны.
23.35. "Крок". "Вялікая мядзведзіца".

Канал "Астанкіна"

5.30. Раніца.
7.50. Брэйн рынг.
8.30. Сарока.
8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.45, 22.50. Навіны.
9.00. У свеце жывёл.
9.40. Гульня па правілах.
14.20. Хроніка дзелавога жыцця.
14.30. Мой маленькі бізнес.
14.40. Дазвольце прадставіцца.
* 15.00. Мульціпрэлія.
15.30. На бале ў Папялушкі.
16.00. Камп'ютэр-хол.
◆16.20. "Элен і рабяты."
16.50. Свет сёння.
17.00 ... Да 18 і старэйшым.
17.30, 20.30. Надвор'е.
17.40. "Хто ёсць хто. XX стагоддзе".
17.55. Баскетбол. Мужчыны. ЦСКА – "Алімпія" (Славенія). У перапынку (18.35) – Гадзіна пік.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Час.
20.40. Масква-Крэмль.
21.00. Ларо "Мільён".
◆21.40. "Раман Імператара".
23.50. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00. Весткі.
7.20. Зоркі гавораць.
7.30. Між іншым.
8.00. Сусветныя навіны Эйбі-сі.
◆8.25. "Пячора "Залатой ружы".
9.20. Музычны экспромт.
◆9.30. "Санта-Барбара".
10.20. Гандлёвы дом.
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
11.05, 13.20. Дзелавая Расія.
13.45. Выратаванне 911.
15.05. Там-там навіны.
15.20. Свята кожны дзень.
15.30. Студыя "Рост".
16.10. Новая лінія.
16.50. Кіно ў студзені.
17.00. Кліп-антракт. М.Распуціна.
17.05. Кіпрас Мажойка. Рэпартажы з Каліфорніі.
17.35. Арт-абстрэл.
18.05. "Ніхто не забыты".
18.10. Непапулярная тэма.
18.25. У свеце аўта- і мотаспорту.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.30. Сон у зімнюю ноч.
21.00. 60 хвілін.
22.30. Рака часу.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Рэк-тайм.

Санкт-Пецярбург

7.00. Добрай раніцы.
10.00. Кубак свету па лыжных гонках.
11.00. Нядзельны лабірынт.
12.40. "Мая музыка". Э.Разанаў.
13.15. Экспрэс-кіно.
13.30. Чароўная лінія.
15.00, 18.20, 19.25. Музычны момант.
◆15.05. "Без сям'і".
16.20. Еўрапейскі калейдаскоп.
16.45. Чароўная лінія.
17.00. Па ўсёй Расіі.
17.10. Навагоднія арбіты каметы "Канфеці".
18.30, 21.30. Інфарм ТБ.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
19.10. Вялікі фестываль.
19.30. "Мёртвыя душы".
20.30. "На біс". Група "Парк Горкага".
21.10. Тэлемагазін.
21.15. Тэлеслужба бяспекі.
21.45. Спартыўныя навіны.
22.00. Ваш стыль.
22.10. "Тэлекампакт". Музычнае шоу.
23.10 – 0.10. "Вечная раніца аперэты".

6, пятніца

Беларускае тэлебачанне

* 8.00. "Косар-волат" і інш.
◆8.45. "Пракажоная" (Францыя). 3-я серыя.
* 9.40. "Прыгоды капітана Урунгеля".
10.10. "Пітэр Пэн". 1-я і 2-я серыі.
12.30. "Фантазія". Фільм-канцэрт.
12.50. "Я + Я". Мужчына і жанчына.
13.30. "А ў полі азярэчка..." Тэленарыс.
◆14.00. "Ляцяць жураўлі".
◆15.35. "Авадзень". 3-я серыя.
16.50. "Тэлебом-біс".
17.30. "Успамін пра Міколу Равенскага". Д/ф.
18.00. Навіны.
* 18.10. "Добры лес".
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Калядны выпуск.
19.25. Сустрэча з Уладзімірам Рыжанковым.
19.45. "Калі б не конкурс..." Музычная праграма.
20.25. Вясёлы уік-энд.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. Студыя "Палітыка". Крэда.
◆21.55. "Пракажоная" (Францыя). 4-я серыя.
22.50. Эканамікст.
23.05. Навіны.
23.25. Святочнае набажэнства ў мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы.

Канал "Астанкіна"

◆8.25. "Дзікая Роза".
8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50. Навіны.
9.00. Дапамажы сабе сам.
9.30. "З намі Бог". Аб святкаванні Каляд ў храме Казанскай Божай маці ў Каломенскім запаведніку.
14.00. Улада і рэформы.
14.20. Хроніка дзелавога жыцця.
14.25. Наш прагноз.
14.30. Да вашых паслуг.
14.40. Шоу і бізнес.
◆15.00. Фільм – дзецям. "Маленькі мсціўца".
16.20. Фігурнае катанне. Чэмпіянат Расіі.
16.50. Свет сёння.
17.00. Чалавек і закон.
17.30. У гэтыя дні праз 50 гадоў.
17.45, 20.30. Надвор'е.
18.00. Бамонд.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.50. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Час.
20.40. Старонкі паэзіі.
21.00. Трансляцыя з Богаяўленскага Кафедральнага сабора г.Масквы.

Канал "Расія"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00. Весткі.
7.20. Зоркі гавораць.
7.30. Між іншым.
8.00. Сусветныя навіны Эйбі-сі.
◆8.25. "Пячора "Залатой ружы". 9-я серыя.
9.15. Ваенны кур'ер.
◆9.30. "Санта-Барбара".
10.20. Гандлёвы дом "Ле Монці".
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
11.05, 13.20. Дзелавая Расія.
13.45. "Свеце ціхі..." Тэлефільм.
15.05. Там-там навіны.
15.20. Свята кожны дзень.
15.30. Студыя "Рост".
16.05. Новая лінія.
16.45. Ніхто не забыты.
◆16.50. "У апошнюю хвіліну". 2-я серыя.
17.45. Экспавідэа.
18.00. Хто мы? Прыгавор "шамякіну" суду.
* 18.45. "Калядная фантазія".
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.30. Я – лідэр.
20.55. Пяць хвілін аб добрым жыцці.
21.05. "К-2" прадстаўляе: "Фрак народа".
22.30. Рака часу.
22.40. Аўтаімгненне.
◆22.45. "Белыя ночы".

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 19.30. Інфарм ТБ.
* 12.10. "Катэрок".
12.20. Фільм-канцэрт.
12.50. На Святой зямлі.
12.55. "Каляды".
* 14.45. "Брэменскія музыкі". 15.10. "Калядная гісторыя". Спектакль для дзяцей.
16.20. На Святой зямлі.
16.25. Чароўная лінія.
16.40. Казка за казкай.
17.30. Калядная служба.
19.10. Вялікі фестываль.
19.50. Спорт, спорт, спорт...
◆20.00. "Выключэнні без правілаў".
21.40. На Святой зямлі.
21.50. "Жаніцьба Бальзамінава". Харэаграфічная фантазія.
23.00. Ваш стыль.
◆23.05. "Яе развод" (ЗША).

7, субота

Беларускае тэлебачанне

8.00. Музычная праграма.
8.30. "Вечная Ісіна". Д/ф.
9.35. Здароўе.
10.10. Слова на Каляды Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха усяе Беларусі Філарэта.
10.25. Існасць. Святочная праграма.
11.10. "Фрагменты". Творы беларускіх мастакоў.
* 11.20. "Лулу – анёл кветак".
11.55. Калядныя сустрэчы.
* 12.40. "Шабуф, шабуф" і інш.
13.25. Шматгалоссе.
13.55. "Вітражныя спраў майстар". Музычны фільм.
14.55. "Калядная зорка-94".
15.55. "Па святых вечарах". Фальклорны тэатр "Госьціца".
◆16.05. "Прасіце і будзе вам..." 1-я і 2-я серыі.
18.05. Запрашаем на вячоркі.
18.55. Міжнародныя спартыўныя навіны.
19.25. Шоу-праграма.
* 20.15. "Калядныя апавяданні".
20.25. Вясёлы ўік-энд.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. Забаўляльная музычная праграма.
◆22.10. "Масква слязам не верыць". 1-я серыя.
23.15. Відзьма-нявідзьма.
◆0.15. "Масква слязам не верыць". 2-я серыя.

Канал "Астанкіна"

* 7.45. "Навагоднія прыгоды"
8.00. "Марафон-15" – малышам.
8.30. Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір".
10.00. Раніцняя пошта.
10.30. Я жанчына.
10.55. Смак.
11.10. "Радуйцеся!" Відэафільм.
12.00. Уручэнне прэміі "Трыумф" за 1994 год.
12.50. Трансляцыя ўрачыстай закладкі храма Хрыста Збаўніцеля ў Маскве.
13.50, 22.50, 24.00. Навіны.
14.00. Фігурнае катанне. Чэмпіянат Расіі. Мужчыны.
14.45. "Краса і гордасць Расіі". Фільм 2-гі.
◆15.15. "Жыццё заапаркаў" (ЗША).
15.55. Галасы Расіі.
16.15. "Ваш выхад, маэстра". Частка 1-я.
17.00. Да і пасля...
◆17.55. "Пераборлівы жаніх".
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Час.
20.35, 21.40. Надвор'е.
20.45. Тэатр + TV.
21.30. Ралі "Парыж–Гранада–Дакар.
21.50. Калядныя сустрэчы.
0.10. Фігурнае катанне. Чэмпіянат Расіі. Жанчыны.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
7.20. Кліп-антракт. В.Чайка.
7.30.Каляды. Д/ф.
8.00. Нав